ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нядзеля, 30 студзеня 1938 г. № 6 (348)

Цана 20 кап

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Магутны рост эканомікі і культуры народаў Савецкага Саюза абумовіў росквіт усіх відаў мастацтваў: літаратуры, тэатра, кіно, музыкі, выяўленчага мастацтва і ўсіх відаў народнай творчасці. Соцыялізм вызваліў чалавечую асобу ад эканамічнага і духоўнага рабства. Дзесяткі тысяч таленавітых людзей з народа, якія пры капіталізме былі асуджаны на духоўнае і фізічнае выміранне, прызваны да творчага жыцця.

У вольны ад непасрэднага ўдзелу ў практыцы соцыялістычнага будаўніцтва час народ стварае першакласныя ўзоры вуснай творчасці, выяўленчага мастацтва, музыкі ды іншых галін мастацтва. Шырокі ўдзел мас у мастацкай творчасці з'яўляецца адным з прыкмет знішчэння розніцы паміж фізічнай і разумовай працай.

Пры соцыялізме кожнаму чалавеку адкрыта найшырэйшая дарога. Яму ёсць дзе разгарнуць свае сілы і здольнасці. Ён упэўнены ў сённяшнім дні і смела глядзіць у заўтрае.

Зусім іншую карціну мы наглядаем у краінах капітала. Там увесь час за спіной у чалавека, як цень стаіць голад і галеча, беспрацоўе, няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Працоўныя пры капіталізме не лічацца за людзей. Яны з маленства вымушаны весці жорсткую барацьбу за сваё існаванне. Слабейшыя з іх гінуць, а больш мацнейшыя вядуць поўгалоднае жыццё. Працоўны чалавек у краінах капітала эксплаатуецца ад калыскі і да труны. Зусім зразумела, што пры такіх умовах не можа быць і гутаркі аб росце і развіцці талентаў. Яны на корані гінуць.

У царскай Расіі здзекам з чалавечай асобы не было меры. Усё мыслячае растоптвалася ботам жандара. Людзі, якія асмельваліся падняць галаву, плаціліся ёю. Доўгія гады пакутаваў скаваны чалавек, пакуль не разагнуўся і не парваў ланцугоў няволі. Імя гэтага чалавека — вялікі рускі народ.

Народы былой «турмы народаў» — Расійскай імперыі — цярпелі падвойны ўціск, — соцыяльны і нацыянальны. Не гледзячы на выключна цяжкія ўмовы, беларускі народ, таксама як і іншыя народы, стварыў сваё мастацтва. Мы і цяпер захапляемся першакласнымі ўзорамі таленавітай народнай творчасці. Гэта залаты фонд нашага мастацтва.

Вялікая Пролетарская соцыялістычная рэволюцыя, развязаліўшая прыгнечаныя раней нацыянальнасці, прызвала іх да жыцця. Беларускі народ пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна — Сталіна пры падтрымцы і дапамозе магутнага рускага народа, ператварыў нашу рэспубліку ў квітнеючую краіну.

Да рэволюцыі беларускі народ не мог нават думаць аб стварэнні свайго прафесіянальнага мастацтва. Пасля рэволюцыі значна вырасла наша літаратура, створана сетка тэатраў, кіно, музычных устаноў на чале з Кансерваторыяй. Партыя большэвікоў выхавала цэлую плеяду таленавітых літаратараў і мастакоў, верных сыноў народа, якія аддана працуюць, ствараючы соцыялістычнае мастацтва.

Рост літаратуры і мастацтва Савецкай Беларусі бясспрэчны. Але гэтыя дасягненні былі-б куды большымі, калі-б на гэтым адказнейшым участку ідэалагічнага фронта не арудавалі праклятыя ворагі народа, якія ўсімі мерамі імкнуліся сарваць стварэнне соцыялістычнага мастацтва.

Гераічны беларускі народ, нашы слаўныя чэкісты пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна нанеслі зруйнавальны ўдар па заклятых ворагах народа, па трацкісцка-бухарынскай бандзе, нацыянал-фашысцкай брыдзе ды іншай погані, якая пралезла ў асяроддзе літаратараў і мастакоў з мэтаю шкодзіць у справе стварэння культуры нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па свайму зместу.

Новае кіраўніцтва ССП БССР (тав. Лынькоў) павінна было зрабіць для сябе належныя вывады, рашуча ліквідуючы рэшткі ўсяго варожага ў літаратуры. Нікому не сакрэт, што работа праўлення ССП БССР была развалена. Старое кіраўніцтва ў асобе тав. Александровіча абанкроцілася. Гэта яшчэ і цяпер дае сябе адчуваць.

Саюз савецкіх пісьменнікаў БССР павінен быў разгарнуць творчую работу сярод літаратараў з тым, каб у бліжэйшыя часы даць народу поўнацэнную мастацкую літаратуру. Гэтага не вядзецца. Створаныя секцыі дрэнна працуюць.

Старшыня праўлення ССПБ тав. Лынькоў не аддае патрэбнай увагі кіраўніцтву саюзам. У ССП БССР не зжыты рэшткі групаўшчыны. Няма сапраўднай творчай атмасферы. Часамі пахне затхласцю, — не выкарчаваны рэшткі варожага з асяроддзя літаратараў.

Кажучы аб рабоце праўлення ССП БССР, нельга абыйсці такога пытання, як кіраўніцтва масавым літаратурным рухам. Ніхто гэтай справай не займаецца. Літаратурныя гурткі на прадпрыемствах, у калгасах развалены. Справа падрыхтоўкі маладых пісьменнікаў пушчана на самацёк. Габінет маладога аўтара абмяжоўваецца толькі кансультацыяй пачынаючых пісьменнікаў дый гэту работу дрэнна вядзе.

Доўгі час асяроддзе літаратараў атручвалася ўсялякага роду варожымі тэорыямі. Бандыты пяра, робячы сваю брудную справу, наносілі нам удар за ударам. Саюз пісьменнікаў, па сутнасці, не выкрыў ні аднаго ворага народа. Гэта гаворыць аб тым, наколькі дрэнна працавала праўленне саюза, саюз у цэлым і мы пісьменнікі. Трэба рашуча паставіць пытанне аб ліквідацыі шкодніцтва на літаратурным фронце.

Шмат горш абстаіць справа на фронце мастацтва. Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР у асобе тав. Патапейкі надзвычай марудна бярэцца за работу па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на фронце мастацтва. Нам неабходна ў бліжэйшыя-ж часы стварыць такія мастацкія творы, якія можна было-б паказаць Маскве, вялікаму Сталіну як дасягненне беларускага народа ў галіне стварэння соцыялістычнага мастацтва.

Неабходна дабіцца, каб кожны тэатр вызначыў тэматычны план, абнародаваў яго, дабіваўся таго, каб савецкія пісьменнікі БССР разам з калектывамі тэатраў стварылі класічны рэпертуар савецкай эпохі.

Баявой задачай беларускай савецкай кінематаграфіі з'яўляецца стварэнне фільма аб беларускай дзяржаўнасці, аб удзеле ў стварэнні БССР друга беларускага народа геніяльнага Сталіна.

Пачэснай задачай беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў з'яўляецца, напісанне оперы аб гераічнай барацьбе рабочых і сялян Савецкай Беларусі за сваё вызваленне.

Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна па-большэвіцку ўзяцца за ажыццяўленне задач, пастаўленых партыяй перад мастацтвам. Пісьменнікі і мастакі акажуць усямерную дапамогу ў справе стварэння соцыялістычнага мастацтва.

Нам неабходна разгарнуць вострую, прынцыповую крытыку работы праўлення ССП БССР, Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, усіх нашых мастацкіх устаноў так, як вучыць нас ЦО нашай партыі «Праўда».

Згуртаваўшыся яшчэ шчыльней вакол комуністычнай партыі, творчыя працаўнікі і мастакі створаць мастацтва, вартае свайго народа, вялікай ленінска-сталінскай эпохі.

Янка Купала

МЫ ЛЮДЗІ СВАБОДНЫЯ

Мы людзі свабодныя,
Вольныя птахі,—
Магутныя, грозныя
Крылляў размахі.

Зямлю не пасціглую
Сэрцам пранялі,
Нябеснай валодаем
Сонечнай даллю.

І поўдні і поўначы
Нам падуладны,
Калышам усходамі
Й захадам здрадным.

Змагаемся з громамі
Сілай нязмернай,
Пярун з бліскавіцамі
Служаць нам верна.

Шлях зоры Крэмлёўскія
Ў сонцы цярэбяць.
Ляцім ясназорныя
Сокалы ў небе.

Мы людзі свабодныя,
Вольныя птахі,—
Магутныя, грозныя
Крылляў размахі.

Грузія, Цхалтуба.
Студзень, 1938.

ГІНАЦВАЛІ

Снег бялеецца ў вышынях—
На гары, на стромкай скале,
Кветкі квецяцца ў даліне,
Ў сонцы, ў кветках гінацвалі.

Было люба мне ў Цхалтубе —
Ў жыватворчай цёплай цхалі,
Было люба, як галубіў
Цябе ў думках, гінацвалі.

Ты лячыла ўсмешкай мілай,
Твае лёкі чаравалі,
Песні радасці будзіла
Ты, грузінка гінацвалі.

Ой, паеду я далёка,
Сэрца сціснецца ад жалю, —
Будзе сумна, адзінока
Без цябе мне, гінацвалі.

Будуць сніцца скалы, горы,
Грузіі цудоўнай далі,
І адна ты з ясных зораў
Сніцца будзеш, гінацвалі.

Грузія, Цхалтуба.
Студзень, 1938.

УВАГА: Гінацвалі—мілая; Цхалі—вада.

ЛЕНІНСКІЯ ПРАДНАЧАРТАННІ ЎВАСОБЛЕНЫ Ў ЖЫЦЦЁ

Даклад тав. А. А. ЖДАНАВА 21 студзеня 1938 г. у Вялікім тэатры на ўрачыста-жалобным пасяджэнні, прысвечаным XIV гадавіне з дня смерці В. І. ЛЕНІНА

Перамога соцыялізма—галоўны вынік

Таварышы, чатырнаццаць год таму назад абарвалася жыццё вялікага настаўніка і кіраўніка працоўнага чалавецтва — Уладзіміра Ільіча Леніна.

У гэты дзень працоўныя Савецкага Саюза разам з працоўнымі ўсяго свету падводзяць вынікі ажыццяўлення вялікіх ідэй, заветаў і прадначартанняў Уладзіміра Ільіча Леніна, ацэньваюць пройдзены шлях і намячаюць перспектывы далейшай барацьбы за перамогу той справы, якой аддаў жыццё Уладзімір Ільіч.



Самым выдатным вынікам ажыццяўлення ленінскіх заветаў і прадначартанняў з'яўляецца перамога соцыялізма ў нашай краіне, тая карэнная перабудова грамадства, якая дасягнута ў нашай краіне.

Таварыш Сталін у сваёй прамове на перадвыбарчым сходзе Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы ўказаў, што «у нас соцыялізм не проста будуецца, а ўжо ўвайшоў у быт, штодзенны быт народа. Год дзесяць таму назад можна было-б дыскутыраваць аб тым, ці можна ў нас будаваць соцыялізм або не. Цяпер гэта ўжо не дыскусійнае пытанне. Цяпер гэта пытанне фактаў, пытанне жывога жыцця, пытанне быта, які пранізвае ўсё жыццё народа».

Таварыш Сталін гаварыў далей:

«На нашых фабрыках і заводах працуюць без капіталістаў. Кіруюць работай людзі з народа. Гэта і называецца ў нас соцыялізмам на справе. На нашых палях працуюць працаўнікі зямлі без памешчыкаў, без кулакоў. Кіруюць работай людзі з народа. Гэта і называецца ў нас соцыялізмам у быту, гэта і называецца ў нас свабодным, соцыялістычным жыццём».

Найвялікшым заваяваннем і перамогай ленінскіх прынцыпаў, ідэй і заветаў з'яўляецца тое, што соцыялізм зараз стаў такой-жа дарагой і блізкай справай як для рабочага Масквы і Ленінграда, так і для народаў, раней самых адсталых, самых прыдаўленых капіталізмам і царызмам, самых прыгнечаных.

Цяпер соцыялізм пранік у самыя аддаленыя куткі савецкай краіны, увайшоў у быт і з'яўляецца неад'емным здабыткам кожнага працоўнага чалавека нашай радзімы, бо нам удалося ўвасобіць у жыццё ленінскія заветы і прадначартанні, пабудаваць грамадства, у якім няма эксплаататараў і паразітаў, пабудаваць грамадства, заснаванае на прыяцельскім супрацоўніцтве рабочых, сялян і інтэлігенцыі, пабудаваць грамадства, заснаванае на свабодным саюзе ўсіх народаў СССР.

Перамога соцыялізма ў нашай краіне — гэта значыць выкананне асноўнага завета нашага правадыра і настаўніка — Леніна. **(Апладысменты).**

Таварышы, я не буду тут прыводзіць лічбаў і фактаў, характарызуючых перамогі соцыялізма ў нашай краіне, перамогі нашай індустрыі і калектыўнай сельскай гаспадаркі. Яны дастаткова вядомы. Я хачу толькі напомніць тут указанне таварыша Сталіна аб тым, што наша рэволюцыя, у адрозненне ад усіх іншых рэволюцый, забяспечыла працоўным нашай краіны не толькі палітычную свабоду, але і матэрыяльныя багацці, стварыла ўмовы заможнага і культурнага жыцця. Гэта заваяванне з'яўляецца самым вялікім, самым каштоўным, самым важным заваяваннем нашай соцыялістычнай рэволюцыі. Яно забяспечвае далейшы пераможны рух рэволюцыі наперад. Гэта заваяванне глыбока пранізвае ўсё наша жыццё і трывала яднае ўсіх працоўных нашай краіны.

Ахвяры, прынесеныя працоўнымі масамі для забеспячэння перамог соцыялізма, не прапалі дарэмна. Гэтыя ахвяры акупіліся тым, што працоўныя атрымалі магчымасць заможнага і культурнага жыцця, атрымалі магчымасць усебаковага развіцця і ўдасканалення сваёй культуры і матэрыяльных умоў жыцця. Гэта складае найвялікшую сілу нашай рэволюцыі і робіць рэволюцыю непераможнай.

Адзінства савецкага народа—найвялікшае заваяванне соцыялізма

Таварышы! Асновай нашага новага ладу з'яўляецца тое, што працоўныя прымаюць непасрэдны ўдзел у дзяржаўным кіраванні.

Сталінская Канстытуцыя, у якой запісаны заваяванні соцыялізма, якая адлюстравала ўсё, што дасягнута працоўнымі ў рэзультаце доўгіх год барацьбы і будаўніцтва — гэта Сталінская Канстытуцыя праведзена ў дзеянне. Выбары ў Вярхоўны Совет прайшлі на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі, якая ажыццявіла ліквідацыю ўсякага роду абмежаванняў усеагульнага выбарчага права, забяспечыла поўнае роўнаправе грамадзян нашай краіны, уне залежнасці ад пола, нацыянальнасці і расавай прыналежнасці. Гэта ёсць далейшы крок наперад у справе ажыццяўлення савецкага соцыялістычнага дэмакратызма ў нашай краіне.

Выбары 12 снежня, якія прывялі да выбарчых урнаў амаль 100 процантаў выбаршчыкаў, прадстаўляюць выдатнае з'явішча ва ўсім нашым жыцці. Выбары паказалі, што маральна-палітычнае адзінства савецкага народа вакол справы Леніна—Сталіна, вакол партыі Леніна—Сталіна ёсць неабвержны факт. Выбары паказалі, што наш народ абсалютна аднадушны ў сваім бязмежным давер'і да вялікай партыі Леніна—Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Выбары, як і ўсё наша штодзеннае жыццё, паказалі, яшчэ і яшчэ раз, што толькі ў нашай краіне магчыма сапраўдная свабода працоўных, толькі ў нашай краіне магчыма сапраўднае братэрства працоўных, бо ў нас перамог соцыялізм. Збыліся прароцкія словы Леніна аб тым, што прыватная ўласнасць раз'ядноўвае, а соцыялізм яднае.

Іменна на аснове таржаства соцыялістычных парадкаў умацавалася ў нас сапраўднае братэрства працоўных. Інтарэсы працоўных нашай краіны адзіны і накіраваны да таго, каб узнімаць і ўдасканальваць соцыялістычную вытворчасць і культуру на карысць нашай радзімы, накіраваны да таго, каб мацаваць і павялічваць наша грамадскае багацце, якое з'яўляецца асновай шчаслівага жыцця кожнага тружаніка.

Уладзімір Ільіч вучыў, што марксісты-большэвікі разумеюць роўнасць як знішчэнне класаў. У нашай краіне — краіне перамогшага соцыялізма ажыццяўляецца сапраўдная свабода, сапраўднае братэрства працоўных, сапраўдная роўнасць, бо ў нашай краіне знішчаны эксплаататарскія класы і быстрымі крокамі ідзе знішчэнне класавых адрозненняў, знішчэнне процілегласці паміж горадам і вёскай.

У нас любы чорнарабочы — свабодны чалавек, які стаіць у сваім палітычным развіцці нязмерна вышэй, чым рабочы капіталістычнай краіны, дзе ён з'яўляецца рабом капітала, рабом эксплаататарскіх класаў.

Толькі на аснове перамогі соцыялізма мог расквітнець савецкі соцыялістычны дэмакратызм. Дыктатура пролетарыята, як вучыў Уладзімір Ільіч, немінуча павінна была прынесці такое змяненне форм дэмакратызма, якое дало нябачанае пашырэнне фактычнага выкарыстоўвання дэмакратызма з боку працоўных класаў.

З гэтага пункту погляду выбары ў Вярхоўны Совет прадстаўляюць выключнае па важнасці значэнне, бо працоўныя нашай краіны поўнасцю выкарысталі свае правы.

Наш савецкі дэмакратызм заснаван не толькі на ўсеагульным, прамым і роўным выбарчым праве пры тайным галасаванні. Ён заснаван на правах працоўных на працу, на адпачынак, на культурнае і заможнае жыццё, — на правах, абумоўленых перамогай соцыялізма.

Іменна таму савецкі соцыялістычны дэмакратызм невымярална вышэй любой буржуазнай дэмакратыі, якая ашуквае рабочых словамі аб братэрстве, роўнасці і свабодзе, а на самой справе захоўвае гнёт капітала, захоўвае багацце на адным канцы і жабрацтва на другім, захоўвае ўсю эканамічную і маральную залежнасць працоўных мас ад капітала, — іх няроўнаправе. Працоўныя масы, пры пановання капітала пазбаўлены магчымасці ажыццяўляць нават тыя куцыя палітычныя правы, якія фармальна прадстаўляе ім буржуазная дэмакратыя, — не гаворачы ўжо аб краінах, дзе нават ад гэтай куцай дэмакратыі не засталося і следу.

На аснове перамогі соцыялізма, на аснове братэрства і адзінства працоўных нашай краіны, аб'яднаных адзінай мэтай ўдасканальвання і ўмацавання соцыялістычнай гаспадаркі, уздыму заможнасці і культуры — на гэтай аснове былі праведзены самыя дэмакратычныя ў свеце выбары.

Маральнае адзінства нашага народа, якое з такой сілай сказалася ў дзень выбараў — 12 снежня — з велізарнай сілай праявілася і ў ходзе першай Сесіі Вярхоўнага Совета.

Работа Вярхоўнага Совета паказала аднадушша ўсіх дэпутатаў і ў гэтым адлюстравалася адзінства волі ўсяго нашага савецкага народа, аб'яднанага адзінствам мэты.

Гэта выразілася ў тым аднадушшы, з якім Вярхоўны Совет выбраў Прэзідыум Вярхоўнага Совета і іншыя свае органы, а таксама Совет Народных Камісараў на чале з Вячаславам Міхайлавічам Молатавым. **(Апладысменты).**

У абстаноўцы магутнай падтрымкі, магутнай дэманстрацыі адзінства народа, якія акружалі ўсю работу Вярхоўнага Совета, сказалася бязмежная любоў і давер'е народных мас да сваёй партыі і да свайго Урада.

Такога адзінства паміж народам і яго кіраўніцтвам, яго Урадам, няма і не можа быць ні ў адной краіне свету. Гэта ўласціва толькі нашай краіне, краіне перамогшага соцыялізма. **(Апладысменты).**

Ва ўсіх кутках савецкай краіны працоўныя людзі, рабочыя і сяляне, робяць вялікую работу па будаўніцтву соцыялізма. У нас — праца стала справай гонару, доблесці і геройства. У нас пашанай і клопатамі акружан кожны працоўны чалавек. Кожны працоўны адчувае гэтыя клопаты аб сабе з боку партыі і Ўрада і ўсведамляе, што ён ёсць неадлучная частка калектыва будаўнікоў і тружанікаў соцыялізма.

Характэрнай асаблівасцю выбараў 12 снежня з'яўляецца тое, што кожная праслойка выбаршчыкаў — старыя і маладыя, рабочыя і інтэлігенцыя, сяляне і рамеснікі, жанчыны і мужчыны — ішла да урнаў, каб аддаць свой голас за нашу партыю, за новыя перамогі соцыялізма, за сваё шчаслівае культурнае жыццё.

Увесь народ аказаўся аб'яднаным ад малага да вялікага і кожная праслойка народа сазнае сваю ролю ў нашым грамадстве, сазнае значэнне свайго ўдзелу ў агульнай справе. Кожны атрад працоўнага насельніцтва сазнае, што ён атрымаў ад соцыялістычнай рэволюцыі тое, аб чым пры капіталізме і царызме нельга было і марыць. Кожны чэсны тружанік нашай краіны ведае, што ён акружан сталінскімі клопатамі, сталінскай увагай. Вось адкуль ідзе аб'яднанне і згуртаванне народа ў прайшоўшых выбарах 12 снежня 1937 г.

Гераізм увайшоў у быт нашага народа

Таварышы! Наш лад выдатны тым, што ён рухае наперад непрыкметных, невядомых пры капіталізме людзей, якія пры капіталізме засталіся-б людскім пылам, сталі-б «лішнімі» людзьмі, як іх называлі ў стары час. Успомніце, як Алексей Максімавіч Горкі маляўніча паказваў у сваіх творах жыццё гэтых «лішніх» людзей, людзей працы, задаўленых ігам капіталізма, людзей, загубленых беспрасветным жыццём у старай, царскай Расіі.

У савецкай краіне няма лішніх людзей. Лішнія людзі ў нас — гэта толькі тыя мізэрныя абломкі разбітых эксплаататарскіх класаў, якія не склалі зброю супроць савецкай улады. Тружанікам, людзям працы — пашана і павага на савецкай зямлі.

Людзі працы самі, уласнымі рукамі твораць новае жыццё. Вось чаму такім пышным цветам квітнеюць у нас народныя таленты. Вось чаму народ вылучае сотні тысяч таленавітых кіраўнікоў на розных участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Вось чаму, таварышы, у нас шырыцца стаханаўскі рух. Іменна таму народ вылучае кожны дзень усё новых і новых герояў працы, герояў абароны, авіяцыі, майстроў культуры, мастацтва, навукі і тэхнікі. У СССР гераізм людзей працы з'яўляецца агульнапрызнаным і агульнарасцаўсюджаным з'явішчам.

У нас гераізм увайшоў у быт народа.

Штосьці не чуваць аб гераізме ў капіталістычных краінах! Яно і зразумела. Чалавек там, у краінах капіталізма, цэніцца толькі як тавар. Там, дзе чалавек цэніцца на рублі, там дзе цэніцца не чалавек, а яго рабочая сіла, як гэта мае месца ў капіталістычных краінах, — там няма месца для гераізма.

Толькі соцыялізм паднімае на нязмерную вышыню сапраўднае значэнне чалавека, стварае магчымасць для ўсебаковага раскрыцця яго духоўных здольнасцей і талентаў. У СССР кожны можа праявіць свой талент і стаць героем.

Практыкай соцыялізма ў СССР ушчэнт разбіты фашысцкія і наогул буржуазныя тэорыі аб тым, што адны расы маюць асобыя здольнасці, у параўнанні з іншымі, што мужчыны маюць асобыя здольнасці, у параўнанні з жанчынамі, што рабочы клас мае меншыя здольнасці, у параўнанні з буржуазіяй.

У нас гэтыя фашысцкія, чалавеканенавісніцкія тэорыі разбіты ўшчэнт. У нас даказана на справе, што кожны народ, на якой-бы ступені развіцця ён ні ўключыўся ў соцыялістычнае будаўніцтва, мае ўсе магчымасці дагнаць іншыя народы ў сваім культурным і гаспадарчым развіцці. У нас даказана на справе і ажыццёўлена на практыцы роўнаправе жанчыны з мужчынам, узаконена палітычна і замацавана эканамічна роўнаправе жанчыны з мужчынам, бо жанчына-работніца стаіць побач з мужчынам ля станка на заводзе, на фабрыцы, разам з мужчынам вядзе работу ў савецкіх установах. У вёсцы калгасны лад забяспечыў жанчыне-калгасніцы незалежнасць ад мужчыны ў быту. Працадзень дае магчымасць сялянцы атрымаць сваю долю благ у адпаведнасці з затрачанай працай. Гэта і складае сапраўдную аснову роўнаправя паміж мужчынам і жанчынай, якое ў нас ажыццёўлена на справе. Жанчына ў СССР працуе ўсюды роўна з мужчынам — і ў дзяржаўным кіраванні, і ў гаспадарчым і культурным жыцці.

Наша моладзь не атручана чалавеканенавісніцкімі, канібалісцкімі ідэямі. Савецкая моладзь мае выдатнае сучаснае і яшчэ больш цудоўнае будучае. Яна свабодна ад ўсякага роду шавіністычных, расісцкіх і іншых буржуазных, фашысцкіх рэакцыйных ідэй.

Кіраўніцтва большэвіцкай партыі—аснова перамог рабочых і сялян

Таварышы! Уладзімір Ільіч Ленін вучыў нас, што галоўнае для забеспячэння перамогі заключаецца ў тым, каб унушыць прыгнечаным і працоўным веру ў свае сілы.

Гэта ўказанне, гэты завет Уладзіміра Ільіча Леніна цалкам і поўнасцю ажыццёўлен у нашай краіне. Працоўныя нашай краіны вераць у свае сілы. Яны ведаюць, што іменна дзякуючы іх барацьбе і працы забяспечана перамога соцыялізма. Яны ведаюць што вера ў свае сілы дасць у далейшым яшчэ большыя перамогі.

З гэтага пункту гледжання мае выключнае міжнароднае значэнне перамога соцыялізма ў СССР. Рабочы клас і сялянства СССР, веруючы ў свае сілы, не далі сябе ашукаць усім, хто падказваў ім няўпэўненасць у свае сілы, усім, хто падобна апартуністам розных масцей, меншавікам, эсэрам і трацкісцка-бухарынскім здраднікам цягнуў рабочых і сялян у ярмо капіталізма. Рабочы клас і сялянства Савецкага Саюза на сваім прыкладзе паказваюць працоўным усяго свету, што азначае вера ў свае сілы, што азначае не паддавацца панікі, не паддавацца нашэптванню ворагаў, якія сцвярджаюць, што рабочыя і сяляне не здольны будаваць новае соцыялістычнае грамадства. Гэту веру ў свае сілы ў рабочых і сялян выхавала і ўмацавала вялікая партыя большэвікоў.

Працяг на 2-й стар.

ЛЕНІНСКІЯ ПРАДНАЧАРТАННІ УВАСОБЛЕНЫ У ЖЫЦЦЁ

Даклад тав. А. А. ЖДАНАВА 21 студзеня 1938 г. у Вялікім тэатры на ўрачыста-жалобным пасяджэнні, прысвечаным XIV гадавіне з дня смерці В. І. ЛЕНІНА

(ПРАЦЯГ).

Нябачанае адзінства народа, якое складае зараз аснову нашага жыцця і з'яўляецца рэзультатам перамогі сацыялізма, непасрэдна звязана з трыумфам нашай партыі, з трыумфам ленінізма.

Ні на адну мінуту мы не павінны забываць, што сваім трыумфам партыя большэвікоў абавязана геніяльным настаўнікам — Леніну і Сталіну, абавязана таму, што яна свята хавае і захоўвае ленінска-сталінскае вучэнне аб партыі.

Ленін — асновапаложнік нашай партыі — стварыў партыю новага тыпу, якая забяспечыла перамогу пролетарыяту.

Ленін вучыў, што наша партыя, для таго, каб атрымаць перамогу, павінна пастаянна мець на ўвазе вышэйшы прынцып пролетарскай дыктатуры — захаванне саюза рабочага класа з сялянствам.

Ленін вучыў, што пролетарыяту, для таго, каб перамагчы, патрэбна партыя баявая, партыя рэволюцыйная, дастаткова смелая для таго, каб павесці пролетарыяў на барацьбу за ўладу, дастаткова вопытная для таго, каб разабрацца ў складаных умовах рэволюцыйнай абстаноўкі і дастаткова гібкая для таго, каб абыйсці ўсе і ўсякія падводныя камні на шляху да мэты.

Ленін, ствараючы партыю, як пудоўны інструмент пролетарыята, вучыў нас, што партыя ёсць вышэйшая форма класавай арганізацыі пролетарыята, у параўнанні з іншымі формамі арганізацыі пролетарыята — профсаюзы, кааперацыя, дзяржаўныя арганізацыі, — работу якіх яна заклікана рухаць і накіроўваць.

Ленін вучыў, што дыктатура пролетарыята можа быць ажыццёўлена толькі праз партыю, як накіроўваючую сілу.

Ленін вучыў, што дыктатура пролетарыята можа быць поўнай толькі ў тым выпадку, калі ёю кіруе адна партыя, партыя комуністаў, якая не дзеліць і не павінна дзяліць кіраўніцтва з іншымі партыямі.

Ленін вучыў нас, што без жалезнай дысцыпліны ў партыі не можа быць ажыццёўлена задача дыктатуры пролетарыята па падаўленню эксплаататараў і перабудове класавага грамадства ў грамадства соцыялістычнае.

Ленін, гаворачы аб нашай партыі, вучыў таму, што сіла нашай партыі заключаецца ва ўзаемадавер'і паміж авангардам рабочага класа і рабочай масай. Ён гаварыў, што партыя павінна чула прыслухоўвацца да голасу мас, уважліва адносіцца да рэволюцыйнага інстынкту мас, вывучаць практыку барацьбы мас, не толькі вучыць, але і вучыцца ў мас. Гэта стварае ўзаемадавер'е паміж авангардам рабочага класа, г. зн. партыяй, і ўсёй масай працоўных.

Гэта азначае, далей, што партыя павінна з дня ў дзень развіваць і заваёўваць сабе давер'е працоўных мас, што яна павінна заваяваць падтрымку мас і ўмець аб'ядноўваць масы. Толькі тады яна можа быць правадыром і настаўнікам свайго класа.

Таварыш Сталін, развіваючы гэтыя палажэнні, указваў на тое, што «сіла большэвікоў, сіла комуністаў заключаецца ў тым, што яны ўмеюць акружаць нашу партыю мільёнамі беспартыйнага актыва». Ён указваў, што «мы, большэвікі, не мелі-б тых поспехаў, якія маем цяпер, калі-б не ўмелі заваяваць на старану партыі давер'е мільёнаў беспартыйных рабочых і сялян».

А што патрабуецца для таго, каб заваяваць гэта давер'е?

Таварыш Сталін гаворыць, што «для гэтага патрабуецца, каб партыйныя не адгараджваліся ад беспартыйных, каб партыйныя не замыкаліся ў сваю партыйную шкарлупу, каб яны не кічыліся сваёй партыйнасцю, а прыслухоўваліся да голасу беспартыйных, каб яны не толькі вучылі беспартыйных, але і вучыліся ў іх». (Сталін — «Пытанні ленінізма», выд. 10, стар. 534).

Таварыш Сталін, далей, неаднаразова ўказваў на тое, што комуністы не павінны кічыцца сваёй партыйнасцю і аддаляцца ад беспартыйных, задзіраць перад імі нос. Партыйцы павінны памятаць, як гаварыў таварыш Сталін, што «не кічлівасць, а скромнасць упрыгожвае большэвіка».

Таварышы! Ці ёсць у нас такая партыя, якая ўсвоіла ўсе гэтыя асноўныя палажэнні ленінска-сталінскага вучэння аб партыі, усе заветы і праднячартанні Леніна аб тым, якой павінна быць партыя?

Так, таварышы, такая партыя ў нас ёсць. І гэту партыю, пасля Леніна, расціў і вёў у напрамку, указаным Леніным, натхняў і арганізоўваў на барацьбу з усімі ворагамі за пабудову соцыялізма таварыш Сталін. **(Працяглыя апладысменты).**

Вучэнне Леніна—Сталіна зыходзіць з таго, што ўсю сваю дзейнасць мы павінны правяраць праз народ, маючы на ўвазе, што комуністы, як гаварыў Ленін, кропля ў народным моры, і што мы можам кіраваць тады, калі правільна выражаем тое, што народ сазнае.

Сапраўдным трыумфам нашай партыі з'яўляецца заваяванне нашай партыяй давер'я народа. Факт галасавання амаль 100 процантаў выбаршчыкаў за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, сам факт нараджэння такога блока паказвае, што народнае давер'е да нашай партыі трывала і несакрушальна. Праверка палітычнай лініі і практычнага кіраўніцтва партыі праз народ была самай сапраўднай праверкай і гэту праверку наша партыя з гонарам вытрымала.

Выбары ў Вярхоўны Совет Усяму свету паказалі, што партыя большэвікоў сапраўды з'яўляецца перадавым авангардам працоўных СССР і карыстаецца бязмежным давер'ем усіх тружанікаў совецкай краіны. **(Апладысменты).**

Да канца выкарчуем ворагаў народа

Пасля смерці Уладзіміра Ільіча нашу партыю павёў па ленінскаму шляху таварыш Сталін. Таварыш Сталін — прадаўжальнік справы Леніна, які ўзброіў партыю на барацьбу за перамогу соцыялізма, стварыў і развіў тэорыю, тактыку і стратэгію барацьбы пролетарыята ва ўмовах аднаўленчага перыяда, а затым ва ўмовах разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва. Таварыш Сталін нястомна вядзе партыю ад перамогі да перамогі, натхняючы яе, навучаючы як трэба змагацца з ворагамі і перамагаць у эпоху вялікай соцыялістычнай рэволюцыі, у эпоху грандыёзных сусветных баёў. **(Бурныя апладысменты).**

Ленін і Сталін, гаворачы аб нашай партыі, указвалі аб неабходнасці жалезнай дысцыпліны ў радах партыі, аб неабходнасці сістэматычнага ачышчэння партыі ад апартуністычных элементаў. З гэтага пункту погляду ўрокі апошніх год, і ў асаблівасці 1937 года, асабліва павучальны.

1937 год быў годам разгрому трацкісцкіх, бухарынскіх і іншых шпіёнаў, разведчыкаў, дыверсантаў і забойцаў, прабраўшыхся ў нашы рады.

1937 год быў годам, калі да дасягненняў у галіне гаспадаркі і культуры, у галіне будаўніцтва Чырвонай Арміі, у галіне развіцця мірных адносін з іншымі дзяржавамі, мы, большэвікі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, дадалі яшчэ адно сур'ёзнае дасягненне. Я маю на ўвазе тое, што мы пачалі ўсур'ёз авалодваць спосабамі і метадамі барацьбы з буржуазнымі разведкамі, з іх агентурай у нашых радах.

Патрабаваўся моцны ўдар па тых работніках, якія забыліся аб непрыемным факце капіталістычнага акружэння, якія забыліся аб тым, што трацкізм ужо даўно перастаў быць палітычнай плынню ў рабочым класе і ператварыўся ў банду наёмных разбойнікаў і забойцаў.

Таварыш Сталін пастаянна вучыць нас таму, што мы не павінны забываць аб факце капіталістычнага акружэння, што капіталістычнае акружэнне засылае і будзе засылаць у наша асяроддзе сваіх разведчыкаў і агентаў. Таварыш Сталін даў нашай партыі прадметны ўрок, як арганізаваць пільнасць на справе, як граміць паспяхова ўсіх тых мярзотнікаў, якія двурушніцкім чынам прабраліся ў рады партыі і прабавалі падсячы і падарваць яе знутры, якія прадаліся заграмічнаму капіталу, якія здрадзілі нашай радзіме і прабавалі вярнуць у нашу краіну капіталістаў і памешчыкаў, зноў надзець на рабочы клас і сялянства ярмо прыгнечання і эксплаатацыі.

1937 год увойдзе ў гісторыю выканання ленінскіх заветаў і праднячартанняў, як год разгрому ворагаў народа. Уладзімір Ільіч вучыў нас, — як вучыць гэтаму і таварыш Сталін, — умець распазнаваць хады і выхады ворагаў, выкрываць і граміць ворагаў.

1937 год увойдзе ў гісторыю, як год узбраення супроць найбольш хітрых і каварных метадаў барацьбы ворагаў народа.

1937 год увойдзе ў гісторыю, як год, калі наша партыя нанесла сакрушальны ўдар ворагам усіх масцей, калі наша партыя стала моцнай і сільнай у барацьбе з ворагамі народа, дабіўшыся гэтага, дзякуючы ўмацаванню нашай совецкай разведкі на чале з Н. І. Ежовым. **(Апладысменты).**

Мы ведаем цяпер, хто з'яўляецца асновай страшэннай, здрадніцкай змовы супроць народа. Мы ведаем цяпер, з якіх колаў рэкрутуюцца гэтыя ворагі. Мы ведаем цяпер, як іх выхоўваюць у капіталістычных контрразведках і ўстановах, прызначаных для гэтага. Гэта — панікёры, труслівыя душонкі, здраднікі, прадажнікі, якія змагаліся ў свой час з Леніным, якія змагаліся на працягу дзесяткаў год з нашай партыяй, якія лічылі за лепшае лізаць боты ў фашыстаў.

Мы нанеслі гэтым здраднікам і агентам фашызма руйнуючы ўдар і будзем надалей выкараняць іх да тла. Гэтым гадзінам няма месца на нашай совецкай зямлі. **(Апладысменты).**

Калі многія з нас, з комуністаў, былі недастаткова моцна падкаваны, недастаткова пільныя для таго, каб умець распазнаваць каварныя метады ворага, то за апошнія годы мы прайшлі суровую школу. Не малых ахвяр каштавала нам аслабленне рэволюцыйнай пільнасці. Шкоднікі нанеслі нямалы ўрон нашай совецкай справе.

Цяпер мы сталі перамагаць у галіне выкрыцця і прадухілення варожай дзейнасці і несумненна разгромім ворагаў канчаткова, якімі-б маскамі яны ні прыкрываліся, з якімі-б ярлыкамі яны да нас ні з'яўляліся. Цяпер гэта справа моцна заваявана большэвіцкай партыяй і працоўнымі нашай краіны. Увесь народ дапамагае органам совецкай разведкі ў справе выкрыцця ворагаў народа.



В. І. Ленін, І. В. Сталін і В. М. Молатаў у рэдакцыі газеты «Праўда» ў 1917 годзе. Малюнак мастака П. Васільева.

Не забываць аб капіталістычным акружэнні

Таварышы! Перамога соцыялізма, умацаванне абароназдольнасці СССР, паслядоўная мірная палітыка совецкага ўрада і партыі забяспечылі працоўным нашай краіны 16 год мірнай працы.

Мы ведаем, што гэты мір падтрымліваць было нялёгка. Мы ведаем, што авантурысты, рэакцыянеры, фашысцкія ўрады многа разоў імкнуліся парушыць мір і перашкодзіць нашаму мірнаму будаўніцтву. Ім не ўдалося гэта таму, што нас вядзе таварыш Сталін, які ўмее распазнаваць шляхі і перапуцці міжнароднай буржуазіі, які ўмее весці наш совецкі карабль у рэчышчы мірнай палітыкі, выкарыстоўваючы ўсе магчымасці для захавання міру. Іменна таму мы, працоўныя Совецкага Саюза, карыстаемся абстаноўкай мірнай працы. **(Апладысменты).**

Аднак, мы не маем права забываць ні на мінуту аб капіталістычным акружэнні. Ужо той факт, што капіталістычнае акружэнне засылае да нас разведчыкаў, шпіёнаў, дыверсантаў, тэрарыстаў, паказвае, як мы павінны быць пільны, зоркі, як павінны глядзець у абодва для таго, каб нам не зрабілі якой-небудзь пакасці.

Мы ведаем, што рэакцыйныя фашысцкія дзяржавы рыхтуюць вайну супроць нас. З гэтым мы, вядома, павінны лічыцца. Але мы ведаем разам з тым, што растуць і мацнеюць сілы, якія гатовы даць адпор фашызму. **(Бурныя апладысменты).**

Совецкі Саюз, строга захоўваючы інтэрнацыянальныя прынцыпы, з'яўляецца магутным фактарам падтрымкі і развіцця руху ўсіх перадавых і прагрэсіўных элементаў чалавецтва.

Усім вядомы нашы сімпатыі да рэспубліканскай Іспаніі. Усім вядомы нашы найглыбейшыя сімпатыі да народа Кітая, які вядзе гераічную барацьбу супроць японскіх авантурыстаў.

Сёння, у дзень чатырнаццатай гадавіны смерці Леніна, нашы мыслі, нашы пачуцці, нашы самыя лепшыя пажаданні мы зварачаем да змагаючагася народа Іспаніі, да змагаючагася народа Кітая і цвёрда ўпэўнены ў тым, што яны пераможуць у барацьбе супроць імперыялістаў. **(Бурныя апладысменты).**

Мы не павінны забываць аб магчымасці ваенных авантур супроць Совецкага Саюза. Вось чаму мы павінны няўхільна мацаваць тэхнічнае ўзбраенне і магутнасць Чырвонай Арміі. Вось чаму мы горача вітаем і павінны ўсямерна выкарыстаць рашэнне ўрада і Вярхоўнага Совета аб арганізацыі Народнага Камісарыята Ваенна-Марского Флота для таго, каб да нашай гераічнай Чырвонай Арміі дадаць вялікі, адпавядаючы значэнню і магутнасці Совецкага Саюза, адпавядаючы аўтарытэту нашай вялікай соцыялістычнай дзяржавы, моцны Ваенна-Марскі Флот. І гэта мы бясспрэчна зробім. **(Апладысменты).**

Мы не забываем аб магчымасці ваенных авантур і павінны быць на-чаку. Калі вораг пасмее парушыць свяшчэнныя граніцы Совецкага Саюза, то да сілы нашай Чырвонай Арміі, да сілы нашай юблеснай авіяцыі, да сілы нашага совецкага Ваенна-Марского Флота мы далучым усе сілы маральнага і палітычнага адзінства 170-мільённага совецкага народа і гора будзе таму, хто пасмее парушыць совецкія граніцы: ён адчуе на сабе гіганцкую і непераможную сілу адзінства совецкага народа! **(Бурныя апладысменты).**

Быць дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу

Таварышы! Нашы поспехі і дасягненні ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры сапраўды вялікія. Але Ленін і Сталін вучаць нас не зазнавацца, не кічыцца поспехамі, цвяроза іх ацэньваць. У сувязі з выкрыццямі ворагаў народа, у сувязі з выкрыццямі агентаў фашысцкіх разведак, мы ўбачылі чаго нам каштавала пераацэнка нашых поспехаў і недаацэнка сіл праціўніка.

Нельга забываць указанняў Леніна і Сталіна аб тым, што мы не маем права пераацэньваць свае поспехі, аб найвялікшай шкодзе галавакружэння ад поспехаў.

Вось чаму ўказанні таварыша Леніна аб тым, якімі павінны быць нашы палітычныя дзеячы, каб пастаянна захоўваць давер'е народа, каб пастаянна быць сапраўднымі кіраўнікамі мас, гэтыя ўказанні для нас з'яўляюцца законам.

Мы павінны быць дзеячамі ленінскага тыпу, як вучыць нас таварыш Сталін. Мы павінны быць такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін. Такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, такімі-ж свабоднымі, як Ленін, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце пачынае вырысоўвацца небяспека. Мы павінны быць мудрымі і непаспешлівымі пры вырашэнні ўсякіх пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін. Павінны быць такімі-ж праўдзівымі і чэснымі, якім быў Ленін, гэтак-жа любіць наш народ, як любіў яго Ленін. Трэба вучыцца быць такімі дзеячамі, якім быў Ленін і якім з'яўляецца таварыш Сталін. **(Бурная авацыя).**

Давер'е народа ёсць вышэйшае давер'е, якое кожны з нас абавязан заслужыць і захоўваць, як зяніцу вока, — вось што неабходна ўкараніць у сазнанне кожнага кіруючага работніка.

Мы павінны выганяць з сваіх радоў — і ў гэтых адносінах Совецкая Канстытуцыя прадастаўляе нам поўную магчымасць — работнікаў таго тыпу, якіх таварыш Сталін азначыў, як людзей, «Ні богу свечка, ні чорту качарга». **(Адабрэнне ў зале).**

Такіх людзей у нас ёсць яшчэ нямала.

Умець даражыць давер'ем народа, умець усюды і заўсёды, на кожным кроку лічыцца з думкай народа, чула прыслухоўвацца да яго голасу, правяраць свае дзеянні праз народ, як гэтаму вучыў Ленін і як гэтаму вучыць Сталін, — не зазнавацца і не паддавацца галавакружэнню ад поспехаў у сувязі з грандыёзнасцю нашых перамог — з аднаго боку, і не ўпадаць у паніку, калі на гарызонце вырысуецца якая-небудзь небяспека — з другога боку, — такая задача.

З гэтага пункту гледжання рашэнне апошняга Пленума ЦК партыі аб выпраўленні памылак, дапушчаных партыйнымі арганізацыямі пры выключэнні з партыі і пры разборы апеляцый выключаных, з'яўляецца выдатным урокам таго, якімі палітычнымі дзеячамі мы павінны быць.

У гэтым рашэнні Цэнтральны Камітэт партыі ўказвае, якую тонкую падрыўную работу можа праводзіць вораг, карыстаючыся слепатой, даверлівасцю і дабрадушшам многіх комуністаў, як ён умее зняслаўляць чэсных партыйцаў, паклёпнічаць на іх, падводзячы іх пад выключэнне з партыі па ўсякага роду фармальных матывах.

Гэта рашэнне Цэнтральнага Камітэта са сталінскай мудрасцю і празорлівасцю ўказвае яшчэ на адзін тып работнікаў, які мае пэўнае распаўсюджанне ў нашых радах, — на тып кар'ерыстаў, якія прабуюць выслужыцца на выключэннях з партыі і дзейнічаюць на руку ворагу, бо яны аслабляюць і адштурхоўваюць ад партыі чэсных людзей.

Такога роду людзі, відаць, прадстаўляюць з сябе даволі ўстойлівы тып, бо яшчэ Шчэдрын пісаў:

«Баюся я гэтых бойкіх маладых людзей, якія дзеля **кар'еры** гатовы адмовіцца ад бацькі і маці, якія, так сказаць, лезь вышаўшы з пялёнак ужо патрасаюць указальным перстам, нібы пагражаючы нябачнаму ворагу: вось я цябе!» **(Вясёлае адабрэнне ў зале).**

Такога роду людзі маюць вядомае распаўсюджанне і ў нашай партыі. Іх-та і мае на ўвазе рашэнне Цэнтральнага Камітэта, якое ўказвае, што неабходна выкрыць падобных кар'ерыстаў, як наносячых велізарнейшую шкоду партыі.

Рашэнне ЦК дае нам прадметны ўрок наконт таго, якімі дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу павінны быць нашы кіраўнікі.

***

Таварышы! Мы ўступілі ў трэцюю сталінскую пяцігодку. Нашай задачай з'яўляецца далейшы ўздым прадукцыйнасці працы і далейшы ўздым культуры.

Быстра і няўхільна — і да гэтага мы маем поўную магчымасць — павінны мы ўздымаць вышэй і вышэй культурнае і матэрыяльнае становішча працоўных, рухаць наперад іх заможнае і культурнае жыццё.

Вядома, якое велізарнае значэнне набывае зараз для нас з пункту гледжання перспектыў развіцця соцыялізма іменна пытанне аб уздыме культуры. З пытаннем аб уздыме культуры наша партыя звязвае пытанне аб пабудове комунізма. Наша партыя і таварыш Сталін звязваюць нашы перспектывы, наша далейшае прасоўванне да комунізма з пытаннем аб стаханаўскім руху, якое мае на ўвазе ўзняць рабочых да культурнага ўзроўню перадавых інжынерна-тэхнічных работнікаў. Іменна таму стаханаўскі рух назван таварышам Сталіным «зярном комунізма». Мы павінны гэта зярно вырошчваць і песціваць, каб яно прынесла свае багатыя плады.

Нам неабходна ліквідаваць адсталасць некаторых участкаў нашай работы, як водны транспарт, лясная гаспадарка і інш.

Разграміўшы шкоднікаў, мы вылучылі многа новых людзей. Мы абавязаны іх вучыць і выхоўваць па-ленінску, па-сталінску, ператвараючы іх у дзеячоў ленінска-сталінскага тыпу.

Перад намі задача: няўхільна шырыць і развіваць рух у карысць высокай прадукцыйнасці працы. Неабходна разгортваць ушыр і ўглыб стаханаўскі рух.

Не так даўно адбылося вядомае рашэнне ЦК, якое ўказвала, што ў стаханаўскім руху нам важны не толькі асобныя рэкорды, але важны агульны ўздым стаханаўскага руху і ўдарніцтва, важны агульны ўздым усёй масы рабочых на глебе барацьбы за стаханаўскую прадукцыйнасць працы.

Перад намі задача: рухаць наперад культуру і заможнасць калгаснага сялянства, уздымаць вышэй і вышэй прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі, ператвараць у жыццё сталінскі лозунг «7—8 мільярдаў пудоў хлеба ў год», лозунг, які блізкі да ажыццяўлення тым больш, што ў 1937 годзе ўраджай зярна з калгасных і соўгасных палёў ужо склаў 7 мільярдаў пудоў.

Задача павышэння ўраджайнасці зерновых і тэхнічных культур, павышэння прадукцыйнасці працы і выкарыстання велізарнай колькасці пудоўных машын, якія рабочы клас з кожным годам усё больш і больш дае калгаснай вёсцы, павінна быць вырашана паспяхова, і, безумоўна, будзе вырашана.

***

Таварышы! На нашу долю выпала велізарнае шчасце першымі пачаць соцыялістычную рэволюцыю. Капіталізм ідзе да канца, ён ужо не ў стане вылучыць з сябе чаго-небудзь прагрэсіўнага і перадавога. Злоба і адчай ахопліваюць пануючыя класы капіталістычнага грамадства, якое не бачыць перспектыў свайго развіцця. Буржуазія смяротна ненавідзіць новы свет, свет соцыялізма.

Затое бадзёрым поступам ідуць наперад народы Совецкага Саюза, перамагаючы ўсе перашкоды на сваім шляху, шчаслівыя і гордыя тым, што іх вядзе, натхняе і арганізоўвае на новыя перамогі вялікі прадаўжальнік справы Леніна — наш Сталін. **(Працяглыя апладысменты).**

ЗМАГАЦЦА ЗА РАЗВІЦЦЕ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Выстаўка народнай творчасці паказала велізарны рост народнага выяўленчага мастацтва БССР. Яна з асаблівай вастрынёй узняла рад практычных пытанняў, якія патрабуюць зараз самага сур'ёзнага вырашэння. Першае, гэта неабходнасць далейшага ўзмоцненага выяўлення і ўчоту самадзейных творчых сіл у галіне выяўленчага мастацтва і мастацкіх рамёстваў і, другое, — неабходнасць неадкладнай арганізацыі шырокай навучальнай сеткі па мастацкай адукацыі. Сістэма мастацкай адукацыі ў БССР знаходзіцца яшчэ на невысокім узроўні. Задача выяўлення і ўчоту самадзейных мастакоў патрабуе наяўнасці пэўнага апарата на месцах, які змог-бы выканаць яе. Аднак ні Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, ні Дом народнай творчасці БССР пакуль-што не маюць сваіх спецыяльных супрацоўнікаў на месцах.

Выхаванне самадзейных мастакоў у БССР патрабуе аператыўнай і ўмелай работы не толькі Дома народнай творчасці, але і профсаюзаў і органаў народнай асветы.

Што патрэбна зрабіць? У першую чаргу неабходна шырокае абмеркаванне на месцах вынікаў выстаўкі «БССР за XX год». Для гэтай мэты неабходна склікаць пры ўдзеле Дома народнай творчасці, Наркамасветы, друку, спецыяльную нараду загадчыкаў райАНА і загадчыкаў дамоў соцкультуры, па пытанню далейшага развіцця народнага выяўленчага мастацтва. Пасля гэтага — правесці ва ўсіх раёнах нарады культактыва. Адначасова такія-ж мерапрыемствы трэба правесці па лініі профсаюзаў.

Што-ж датычыць арганізацыі практычнай і сістэматычнай вучобы самадзейных мастакоў, дык тут трэба ўлічыць некаторыя асаблівасці. У калгасах і соўгасах у нас пакуль-што гурткоў выяўленчага мастацтва няма. Самадзейныя мастакі працуюць самастойна і асобна адзін ад другога, што, безумоўна, з'яўляецца сур'ёзнейшым тормазам у справе ўзняцця іх мастацкай адукацыі. Арганізацыя гурткоў выяўленчага мастацтва, якія-б аб'ядналі ўсе гэтыя раскіданыя сілы, — важнейшая задача. У гэтых адносінах асабліва добрыя ўмовы на фабрыках і заводах, дзе ёсць групы самадзейных мастакоў (фабрыка імя Кагановіча — Менск, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» — Віцебск і т. д.), аднак, да гэтага часу і на гэтых фабрыках гурткі не арганізаваны. Напрыклад, на фабрыцы імя Кагановіча ў Менску ёсць група маладых мастакоў, якія жадаюць займацца. Аб іх вучобе вяліся ўжо неаднаразовыя перагаворы, адбыліся нават першыя заняткі, але далей гэтага справа не пайшла. Фабкомы прадпрыемстваў маюць сродкі і на харавыя гурткі, і на драматычныя і інш., а для гуртка выяўленчага мастацтва сродкаў чамусьці не знаходзяць.

Калі на фабрыках і заводах былі дзе-якія спробы арганізаваць гурткі, дык у калгасах работа ў гэтым напрамку яшчэ і не пачата. Велізарную ролю маглі-б тут адыграць раённыя дамы соцкультуры, якія маглі-б стаць цэнтрамі мастацкага выхавання ў раёне. У Лёзне, напрыклад, арганізаван гурток выяўленчага мастацтва. Была спроба арганізацыі гуртка і ў Смалявічах, аднак загадчык райАНА Абраменка не падтрымаў гэтага пачынання.

Адначасова з арганізацыяй гурткоў неабходна стварыць студыі ў буйнейшых гарадах БССР. У гэтых адносінах ёсць вопыт, але, на жаль, яшчэ вельмі неўцяшальны. Студыя ў Менску працуе нездавальняюча. І ў першую чаргу з-за адсутнасці памяшкання. Ворагі народа, якія сядзелі раней у горсовеце, не давалі студыі магчымасці працаваць у прыгодным памяшканні. На ўсе яе просьбы адказвалі поўным маўчаннем. І зараз студыя знаходзіцца ў дрэнным памяшканні.

Гісторыя арганізацыі магілеўскай студыі таксама заслугоўвае ўвагі. Пасля таго, калі студыя ўжо мела і памяшканне, і праграму, і каштарыс, і настаўніка, — не аказалася ў магілеўскім горсовеце двух тысяч рублёў на яе адкрыццё.

Ворагі народа, якія сядзелі ў віцебскім горсовеце, на пытанне аб арганізацыі студыі адказвалі каротка — не можам адкрыць. І не адкрылі. А ў Віцебску ёсць таленавітыя самавучкі, ёсць і настаўнікі.

Студыя ў Гомелі існуе даўно. Аднак, рэзультаты яе мізэрныя. Яна патрабуе рашучай рэарганізацыі.

Вось гісторыя стварэння чатырох студый. Арганізацыя студый у гарадах БССР — важнае мерапрыемства ў справе развіцця народнага выяўленчага мастацтва і падрыхтоўкі кадраў для вышэйшых мастацкіх навучальных устаноў. Надзвычай каштоўнай справай можа з'явіцца і арганізацыя пры Доме народнай творчасці завочнага навучання па выяўленчаму мастацтву. У Менску, Віцебску і іншых гарадах ёсць дастаткова кваліфікаваных мастакоў, якія маглі-б з поспехам весці кансультацыйную работу. А попыт на завочнае навучанне вельмі вялікі.

Надзвычай важным мерапрыемствам павінна быць арганізацыя раённых і акруговых выставак народнай творчасці. Гэта дасць магчымасць высветліць рост народнай творчасці па асобных раёнах і акажа значную дапамогу ў справе падрыхтоўкі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, дзе народная творчасць БССР павінна быць паказана разгорнута і ярка.

Такім чынам арганізацыйна-палітычныя мерапрыемствы па народнаму выяўленчаму мастацтву зводзяцца да наступнага: праводзенне шырокай растлумачальнай работы аб значэнні народнага выяўленчага мастацтва і скліканне ўсебеларускай нарады загадчыкаў райАНА і дамоў соцкультуры. З боку адпаведных арганізацый павінны быць дадзены ўказанні профсаюзам і райвыканкомам аб палітычнай і культурнай важнасці справы развіцця народнага выяўленчага мастацтва і неабходнасці прыняцця ўсіх мер да забеспячэння гэтай справы. Павінна быць арганізавана шырокая сетка гурткоў па выяўленчаму мастацтву на фабрыках і заводах, у буйных клубах і дамах соцкультуры, у калгасах і соўгасах, адкрыты студыі ў буйнейшых гарадах БССР, арганізаван пры Доме народнай творчасці аддзел завочнага навучання і кансультацыйна-метадычнай работы з асобнымі самадзейнымі мастакамі, арганізаваны выстаўкі па раёнах БССР.

Асаблівае месца займала на выстаўцы «БССР за XX год» мастацкае рамяство: ткацтва, вышыўка, разьба па дрэву, кераміка і інш. Што і казаць — велізарны багацці народнага арнамента! Шматлікія вырабы залатых рук нашых калгасніц паказалі гэта на справе. Ручнікі, посцілкі, коўдры, вопратка, дываны, паясы — узаемна дапаўнялі і вылучалі адно другое сваёй прыгожасцю, каляровасцю, разнастайнасцю, высокай тэхнікай выканання. Гэта майстэрства відаць было і ў інкрустацыі па дрэву, і ў кераміцы, і інш. Аднак, становішча ў гэтай справе далёка нездавальняючае. Большасць майстроў мастацкіх рамёстваў не аб'яднаны ў арцелі і таварыствы Белсаміпрамсовета.

Першачарговай задачай з'яўляецца выяўленне ўсіх гэтых майстроў і арганізацыя іх у арцелі і таварыствы для забеспячэння іх палітычнага і мастацкага росту, для арганізацыі шырокага выпуску масавых мастацкіх вырабаў. Адначасова неабходна стварыць пры Белсаміпрамсовеце сетку курсаў для ўдзельнікаў гурткоў усіх відаў мастацкіх рамёстваў.

Дом народнай творчасці БССР павінен быць арганізацыяй, якая мае шырокую сетку працаўнікоў у раёнах, і быць сапраўды домам, у прамым сэнсе гэтага слова, г. зн. мець адпаведнае памяшканне, дзе знайшлі-б сабе месца добра абсталяваныя габінеты для метадычнай работы па ўсіх відах народнай творчасці. Аднак, працаўнікоў на месцах няма і дома ніякага няма. Увесь «дом» змяшчаецца ў адным з пакояў Упраўлення па справах мастацтваў, дзе пры найлепшых жаданнях нельга працаваць так плённа, як хацелася-б.

Час стварыць патрэбныя ўмовы Дому народнай творчасці БССР. Гэта арганізацыя ўпаўне апраўдала сябе і мае наперадзе перспектывы вялікай, плённай работы ў галіне развіцця народнай творчасці БССР.

А. ЕГОРАЎ.

Да ўсіх работнікаў навукі, літаратуры і мастацтваў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

Дарагія таварышы!

23 лютага 1938 года спаўняецца 20-годдзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, з якімі мы, работнікі мастацтваў, звязаны непарыўнай дружбай з першых дзён іх існавання.

З боку Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і яе правадыра, роднага для нас Клімента Ефрэмавіча Варашылава, мы заўсёды бачылі дружбу, ласку, увагу і велізарную дапамогу ў нашай творчай рабоце.

Узаемадачыненне з Чырвонай Арміяй і Флотам дапамагала работнікам мастацтваў у росце іх палітычнай свядомасці і ў іх творчай рабоце. Гісторыя гераічнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — гісторыя іх барацьбы і перамог — заўсёды натхняла артыстаў, пісьменнікаў, кампазітараў і мастакоў на стварэнне выдатнейшых мастацкіх твораў і вобразаў.

Мы, работнікі мастацтваў, з'яўляемся адным з атрадаў совецкай інтэлігенцыі, аб якой Міхаіл Іванавіч Калінін сказаў, што «мы нашу інтэлігенцыю будзем таксама любіць, як любім Чырвоную Армію». Мы ганарымся такімі адносінамі да нас з боку партыі і ўрада. Гэтак-жа, як і ўвесь совецкі народ, мы гарым свяшчэннай нянавісцю да ўсіх ворагаў нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны, да ўсіх прадажных здраднікаў радзімы.

Усе свае сілы мы аддадзім служэнню нашай выдатнай краіне, яшчэ шчыльней згуртуемся вакол нашай большэвіцкай партыі і любімага правадыра — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

На працягу 20 год мы неслі Чырвонай Арміі і Флоту сваё мастацтва, выступаючы перад чырвонаармейцамі і чырвонафлотцамі на франтах грамадзянскай вайны і ў перыяд мірнага будаўніцтва, у чырвонаармейскіх інтэрнатах, на караблях, у клубах і дамах Чырвонай Арміі, на вучэннях і манеўрах. За гэтыя годы мы накапілі багаты вопыт работы па шэфству над РСЧА, прынятаму работнікамі мастацтваў яшчэ 15 год таму назад, 23 лютага 1923 года.

Мы, работнікі трох ордананосных тэатраў сталіцы Саюза ССР — Дзяржаўнага Вялікага Акадэмічнага Тэатра Саюза ССР, Дзяржаўнага Акадэмічнага Малага Тэатра Саюза ССР, Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага Тэатра Саюза ССР імя Горкага, звяртаемся да ўсіх работнікаў навукі, літаратуры і мастацтваў з заклікам цяпер-жа прыступіць да падрыхтоўкі святкавання 20-годдзя нашых магутных і родных Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Таксама, як мы гэта рабілі да гэтага часу, мы і наперад абавязваемся нашы лепшыя творчыя замыслы, выступленні і пастаноўкі прысвячаць нашым родным Чырвонай Арміі і Флоту.

Мы абавязваемся на працягу студзеня і лютага 1938 года арганізаваць творчыя справаздачы і рапарты тэатраў і майстраў мастацтваў для Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Мы абавязваемся ўлетку 1938 года арганізаваць мастацкія брыгады, якія з сваімі лепшымі спектаклямі і канцэртамі паедуць у часці РСЧА і ў Ваенна-Марскі Флот.

Соцыялістычнае спаборніцтва за пераходны сцяг Наркамата Абароны СССР дапаможа нам дастойна разгарнуць культурна-шэфскую работу ў РСЧА.

Мы звяртаемся да ўсіх нашых сяброў і таварышоў — работнікаў навукі, літаратуры і мастацтваў — з прапановай абмеркаваць наш зварот і найбольш вартым чынам падрыхтавацца да святкавання 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота.

Няхай жыве магутная і непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і яе таленавіты палкаводзец, непахісны ленінец-сталінец, любімы ўсім народам першы маршал Совецкага Саюза Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве наша родная большэвіцкая партыя і правадыр народаў Совецкага Саюза, мудрэйшы з мудрых, наш любімы друг Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Народныя артысты СССР: В. НЕМІРОВІЧ-ДАНЧЭНКА, І. МАСКВІН, В. КАЧАЛАЎ, Л. ЛЕАНІДАЎ, А. ЯБЛАЧКІНА, О. КНІППЕР-ЧЭХАВА, К. ДЗЕРЖЫНСКАЯ, В. БАРСАВА, А. ТАРАСАВА, Б. ДАБРАНРАВАЎ, М. РЭЙЗЕН. Народныя артысты РСФСР: М. ЛІЛІНА, М. НАРОКАЎ, В. ЛУБЕНЦОЎ, Н. ХАНАЕЎ, Н. ОЗЕРАЎ, Ю. ФАЙЕР. Заслужаныя дзеячы мастацтваў: А. МЕЛІК-ПАШАЕЎ, І. СУДАКОЎ, Ф. ФЕДАРОЎСКІ. Заслужаныя артысты РСФСР: В. ДАВЫДАВА, Е. КРУГЛІКАВА, К. ЕЛАНСКАЯ, В. КРЫГЕР, А. СЦЕПАНАВА, Н. ЛІТОЎЦЭВА, Е. ТЕЛЕШЭВА, Н. ПАДГОРНЫ, М. ПРУДКІН, Б. ЛІВАНАЎ, В. ЕРШОЎ, І. КАЗЛОЎСКІ, С. ЛЕМЕШЭЎ, І. КУДРАЎЦЭЎ, В. ОРЛОЎ, Б. ІЗРАІЛЕЎСКІ. Лаўрэат міжнароднага конкурса піяністаў у Вене Я. ФЛІЭР. Дырэкцыя ГАБТ СССР — Я. ЛЕОНЦЬЕЎ. Дырэкцыя Малага Тэатра — З. ДАЛЬЦЭЎ. Дырэкцыя МХАТ СССР імя Горкага — Я. БАЯРСКІ.

РАБОТНІКІ МАСТАЦТВА— ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

20-я гадавіна гераічнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота—вялікае свята ўсіх працоўных нашай соцыялістычнай радзімы. Чырвоная Армія — неадрыўная частка совецкага народа — карыстаецца ўсеагульнай любоўю. Да надыходзячай гадавіны актыўна рыхтуюцца ўсе рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя.

Рыхтуюць свае падарункі Чырвонай Арміі і работнікі мастацтва. З 18 па 27 лютага работнікі мастацтва пакажуць для часцей Чырвонай Арміі і войск НКВД бясплатна рад спектакляў і канцэртаў.

18 лютага ўсе тэатры БССР дадуць спектаклі для гарнізонаў. 19 лютага ўсе тэатры і музычныя ўстановы выедуць з канцэртамі ў падшэфныя чырвонаармейскія часці. 20 і 21 лютага — дні выездаў канцэртных брыгад у часці пагранвойск. 22—23—24 лютага адбудуцца выезды канцэртных брыгад у часці Чырвонай Арміі. За гэтыя тры дні адны толькі менскія калектывы дадуць 23 канцэрты (Тэатр оперы і балета—8, Белдзяржфілармонія—6, Кансерваторыя—5 і Радыёкамітэт—4).

24 лютага зноў ва ўсіх тэатрах БССР адбудуцца мэтавыя спектаклі для гарнізонаў. 25 лютага арганізуецца вялікі канцэрт майстроў мастацтва для начсастава Менскага гарнізона. У гэты-ж дзень ва ўсіх тэатрах адбудуцца вечары работнікаў мастацтва разам з падшэфнымі часцямі. 26—27 лютага—зноў выезды канцэртных брыгад у часці пагранвойск.

Такім чынам, святкаванне 20-й гадавіны Чырвонай Арміі ў БССР будзе азнаменавана дзкадай культурнай сувязі работнікаў мастацтва з Чырвонай Арміяй.

Апрача спектакляў і канцэртаў, работнікі мастацтва праводзяць у парадку шэфства над Чырвонай Арміяй і іншыя каштоўныя мерапрыемствы. Так, усе мастацкія калектывы вылучаюць творчых работнікаў у дапамогу падшэфным часцям для кіраўніцтва гурткамі мастацкай самадзейнасці і падрыхтоўкі святочнага рэпертуара. Пры Беларускім дзяржаўным драматычным тэатры ў Менску арганізуецца двухдзённы семінар для кіраўнікоў гурткоў чырвонаармейскай драматычнай самадзейнасці. Нарэшце, да 20-й гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ў Менску пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі будзе адкрыт інстытут музычнай культуры для начсастава гарнізона.

Актыўны ўдзел у святкаванні 20 гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота прымуць таксама жывапісцы. З іх дапамогай будуць аформлены ленінскія куткі ў чырвонаармейскіх часцях. Многія мастакі рыхтуюць для падшэфных часцей свае падарункі—партрэты, карціны, мастацкія плакаты.

І. П.

Фармалістычныя і натуралістычныя скажэнні ў працы Белдзярждрамтэатра

Фармалізм, як і натуралізм, пранікнуў у беларускае тэатральнае мастацтва даўно. Ужо ў самым пачатку работы Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра мы маем грубае скажэнне класічных твораў ва ўгоду «моднаму» ў той час фармалістычнаму трукацтву. У 1923 годзе ў пастаноўцы «Мешчанін — дваранінам» Мальера рэжысёр Міровіч робіць «асучасніванне Мальера». У пісьмо Журдэна да Дарымэны ўстаўляецца фраза: «З комуністычным прывітаннем». Журдэн гаворыць слугам: «Пойдзем на Камароўку і Старажоўку»—вядомыя менскія ваколіцы, і г. д. Акторы на сцэне ўвесь час без патрэбы кувыркаюцца, коўзаюцца па нахіленых дошках і робяць іншыя, зусім не ўласцівыя вобразам п'есы, акрабатычныя трукі.

У пастаноўцы «Чырвоная маска» пастаноўшчык Міровіч не думаў аб праўдзівым паказе рэволюцыйнай барацьбы ў капіталістычным Захадзе, яго цікавілі розныя кульбіты, незвычайныя рытмічныя рухі, свавольная акрабатыка, што абвяшчалася ўзорам найноўшай тэатральнай сістэмы — «мейерхольдаўскай біямеханікай».

Беларускія нацыянал-фашысты, як вядома, увесь час арыентавалі беларускае мастацтва на пераймание буржуазных фармалістычных напрамкаў. Іх дзейнасць на тэатральным фронце выявілася ў з'яўленні на сцэнах спектакляў, якія фальсіфікавалі гісторыю, у прыватнасці, гісторыю беларускага народа, у з'яўленні наскрозь варожых, антысовецкіх спектакляў.

Большая частка акторскага калектыва Белдзярждрамтэатра, выхаваная ў лепшых рэалістычных традыцыях сцэнічнага майстэрства, супраціўлялася фармалістычным ухілам у творчасці тэатра. Рэжысёр Крапуска, які паставіў наскрозь фармалістычны спектакль «Справа гонару», быў па настаянню калектыва адразу-ж вызвалены ад работы ў тэатры. У выніку шматгадовай рашучай і ўпартай крытыкі рэжысёра Літвінава, ён у апошніх сваіх работах пачаў адыходзіць ад фармалістычных метадаў працы, пачаў аналізаваць свае памылкі і, у прыватнасці, перагледзеў свае адносіны да Мейерхольда, якога ён раней усяляк выслаўляў, залічыўшы сябе ў яго вучні і прыхільнікі.

Літвінаў імкнуўся пераймаць у Мейерхольда не толькі вонкавыя формы яго спектакляў, але і цалкам прывіваў калектыву беларускага тэатра метады яго працы. Карыстаючыся сваёй пасадай мастацкага кіраўніка, Літвінаў устанавіў дыктатуру рэжысёра ў тэатры, з прычыны чаго роля грамадскіх арганізацый, мастацкага совета была зведзена да пасіўнай фіксацыі фактаў. П'есы ў рэпертуар выбіраліся па ўласнаму меркаванню Літвінава, згодна яго планаў і густаў. Рэалістычнае майстэрства вядучай часткі актораў было абвешчана кансерватыўным.

Маючы за спіной рад знятых з рэпертуара фармалістычных спектакляў, пастаўленых у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры, Літвінаў, прышоўшы ў Белдзярждрамтэатр, адразу-ж абвясціў «рашучую» барацьбу натуралізму, як галоўнай небяспецы для тэатра. Аднак, на справе гэта аказалася простай шыльдай. У першых-жа пастаноўках адкрыўся знаёмы твар фармаліста, для якога не чужды і натуралістычныя прыёмы.

Неразуменне ідэйнай блізкасці фармалізма і натуралізма вельмі характэрна для мастакоў-фармалістаў, якія часта лічаць натуралізм сваім антыподам у той час, калі абодва яны, народжаныя распадам буржуазнай культуры, аднолькавыя ў сваёй аснове.

Цяжкія жалезныя сякеры і алебарды ў «Жакерыі», бясконцыя пачухванні, пакарханні, пляўкі ў «Гуце»—аднолькава тыповыя прыклады натуралізма на сцэне, як і замена добра зробленай бутафоры натуральнымі антыкварнымі рэчамі («Дама з камеліямі» ў тэатры імя Мейерхольда).

Мастак-фармаліст наўмысля скажае гістарычную праўду ў класічных і сучасных творах у суадпаведнасці са сваёй канцэпцыяй. Часам ім кіруе жаданне здзівіць усіх смеласцю сваёйператрактоўкі зместу. Гэта тыповы творчы анархізм, які ідзе ад дробна-буржуазнага індывідуалізма, самазахаплення і разбэшчанасці.

У спектаклі «Недарасль» самым бязлітасным чынам скажаецца выдатны шырокавядомы класічны твор, а, значыць, скажаецца паказ гісторыі і нораваў тагочаснага грамадства. У п'есу механічна ўстаўляюцца ўрыўкі з іншых твораў Фанвізіна («Брыгадзір» і інш). Соф'я трактуецца, як будучая Прастакова, Прастакова—Салтычыха, Мілон — Скалазуб і г. д. У гэтым спектаклі можна было адразу-ж пасля якой-небудзь умоўнай мізансцэны бачыць самае натуралістычнае выбіванне пылу з палавікоў і інш.

У спектаклі «Вялікадушнасць» гісторыя Парыжскай Комуны паказваецца толькі з боку яе вялікадушнасці і лібералізма да ворагаў, прычым гэтыя моманты ідэалістычна перапаваляліваюцца. Такім чынам і тут мы маем выразнае скажэнне гісторыі.

У радзе іншых спектакляў у Літвінава элементы фармалізма і натуралізма ў той ці іншай меры пераплятаюцца між сабой, засланяючы тое здаровае, рэалістычнае, гістарычна праўдзівае, яркае і цікавае, што ў іх бяспрэчна ёсць.

Так, у спектаклі «Бацькаўшчына», у якім рэалістычна правільна раскрываецца тэма аб новай соцыялістычнай бацькаўшчыне, зроблены два фармалістычных варыянты афармлення спектакля.

У цэнтральным вобразе п'есы, вобразе Леапольда Гушкі, заслужаны артыст рэспублікі Владамірскі часам вельмі напружваецца, пачынае палохаць аудыторыю ўтрыраванымі жэстамі, што, бясспрэчна, ідзе ад вонкавага ўяўлення вобраза, а не ад глыбокага асэнсавання яго ўнутранай сутнасці. Часам Леапольд Гушка залішне багата пачухваецца, пазяхае. Бытавыя дэталі ім змазваюцца, абыгрываюцца натуралістычна.

У пагоні за ўнешне эфектнымі сцэнамі Літвінаў прымушаў аўтара дапісваць рад новых сцэн, якія абцяжарвалі спектакль і былі ў свой час выкінуты. Тое-ж самае можна сказаць і аб спектаклі «Салавей», у якім, часам, у пагоні за ўнешнім эфектам парушаецца псіхалагічны план вобраза.

Адам Сянчук («Салавей»), даведаўшыся аб трагічным становішчы сваёй сям'і, пачынае бестурботна іграць на цымбалах «Лявоніху» толькі таму, што пастаноўшчыкам (Л. Літвінаву і Л. Рахленка) спатрэбілася ўвесці атракцыён масавага танца. У апошнім акце, пасля прыходу сялян з караваем, адбываецца балет-пантаміма, які бясспрэчна затрымлівае дынаміку дзеі. Праўда, гэтыя паасобныя зрывы не з'яўляюцца стылем усяго спектакля, які ў асноўным вытрыманы ў правільных, рэалістычных тонах, праўдзіва паказваючы адну з старонак барацьбы беларускіх сялян за сваё вызваленне ад панскага прыгону.

У спектаклях «Капітанская дачка», «Салавей» Л. М. Літвінаў выразна паказвае шчырае жаданне да перагляду і адмаўлення ад сваіх фармалістычных пазіцый.

У гэтым сціслым артыкуле мы не ставілі перад сабой задачы паказаць і прааналізаваць усе фармалістычныя і натуралістычныя скажэнні ў творчай практыцы Белдзярждрамтэатра. Мы паказалі толькі на некаторыя найбольш тыповыя з'явішчы, тым больш, што гэтыя шкодныя совецкаму мастацтву буржуазныя тэндэнцыі не з'яўляюцца вядучымі ў творчасці тэатра, які вядомы шырокаму гледачу і любімы ім за спектаклі «Жыццё кліча», «Платон Крэчэт», «Ваўкі і авечкі», «Капітанская дачка», «Апошнія» «Салавей» і інш., у якіх стыль соцыялістычнага рэалізма знаходзіць сваё канкрэтнае здзейсненне. Выпраўляючы паасобныя зрывы і памылкі ў гэтых спектаклях, на іх вопыце трэба развіваць далей лінію ўздыму, лінію стварэння сапраўды народных, блізкіх і патрэбных шырокім масам совецкага гледача, высокамастацкіх спектакляў, вартых сталінскай эпохі.

Е. РАМАНОВІЧ.


Кампазітары БССР да слаўнага 20-годдзя

⊙ Кампазітар **Пукст** напісаў песню «Чырвоны вартавы» (тэкст М. Хведаровіча) і паэму для сімфанічнага аркестра з хорам, прысвечаную Чырвонай Арміі і яе слаўнаму палкаводцу К. Е. Варашылаву. У паэме хор выконвае песню «Падымем-жа чаркі» (з «12 песень аб Чырвонай Арміі і яе палкаводцу тав. Варашылаву»). Творы ўжо вышлі з друку.

⊙ Кампазітар **Палонскі** закончыў літаратурна-музычны мантаж «Сёмая Самарская» (тэкст В. Глазырына).

⊙ Масавую песню аб Будзённым напісаў кампазітар **Любан** да оперы Багатырова «Дрыгва». Ім-жа напісана песня аб Н. І. Ежову на тэкст І. Шапавалава.

⊙ Кампазітар **Лукас** напісаў музычна-драматычную баладу на словы з паэмы кітайскага пісьменніка Тіма-Вень «19 год» і песню «Чэкіст».



Грузінскія мастакі рыхтуюцца да 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. НА ЗДЫМКУ: скульптура Т. Сіхарулідзе «Снайпер», якая будзе паказана на выстаўцы. Фота О. Будзештацкага (СФ).

НОВЫЯ КНІГІ

да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота

Да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ў выданні Белдзяржвыдавецтва выйдзе з друку зборнік ваенных апавяданняў Ул. Глазырына «Незабыўныя дні».

* * *

Таксама выйдзе з друку зборнік народных песень на рускай і беларускай мовах, складзены кампазітарам Любанам. Раскошна афорамлены зборнік уключае каля 100 песень з нотамі. Зборнік прысвячаецца Чырвонай Арміі.



З выстаўкі народнай творчасці. «Фізкультурніца» — бюст работы скульптара-самавучкі тав. Мазо.

Фота І. Каплінскага.

МАСТАКІ БССР АБ САБЕ

Мае новыя работы ў 1938 годзе

Мне 69 год. Можна сказаць, што я ўжо стары чалавек. Але ў наш шчаслівы час я адчуваю ў сабе маладую сілу і вялікае жаданне — тварыць, тварыць і тварыць.

Ведаю, што на старасці год, калі сілы пакінуць мяне, мне не давядзецца жыць у холадзе і голадзе. Мудры сталінскі закон забяспечыць маю старасць.

Першым маім творам у гэтым годзе будзе партрэт таго, хто пранізаў мой мозг багатымі мастацкімі вобразамі — партрэт вялікага і простага чалавека І. В. Сталіна, які слухае даклад. Я прыкладу ўсе сілы для таго, каб у гэтым партрэце адлюстраваць рысы геніяльнасці, мужнасці і прастаты гэтага вялікага чалавека.

Другім творам будзе партрэт нашага любімага дэпутата, слаўнага палкаводца, маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава.

Пасля гэтага я пачну працаваць над партрэтам героя арктычных паходаў О. Ю. Шмідта на фоне Паўночнага полюса.

Мастак Я. М. КРУГЕР.

Паэзія Змітрака Бядулі

Зм. Бядуля—Збор твораў. Том І, ДВБ, 1937.

Бадай, першы раз наша Дзяржаўнае выдавецтва паказала чытачу Зм. Бядулю як паэта, хоць і гэты раз з недастатковай паўнатой. У першы том збору твораў не ўключаны вершы ў прозе, пачынаючы з «Абразкоў», не ўключана шмат вершаў, якія раней друкаваліся ў газетах і журналах, не гледзячы на тое, што гэтыя вершы і ў мастацкіх і ў ідэалагічных адносінах падыходзілі-б для перавыдання.

Але і тое, што зроблена, заслугоўвае пахвалы: томік паэзіі Бядулі, па-першае, як-бы аднаўляе ў нашай паэзіі аднаго з дакастрычніцкіх паэтаў Беларусі — Ясакара (зусім несправядліва забытага сучаснай крытыкай і літаратуразнаўцамі), аднаўляе сакавітую, прыгожую паэзію Бядулі паслякастрычніцкага перыяду, па-другое, дае нашаму чытачу, вельмі карысную і каштоўную кнігу паэзіі, якая адлюстроўвае гісторыю развіцця беларускай паэзіі на працягу досыць вялікага часу, а па-трэцяе, дае маладым пісьменнікам шмат вельмі трапных прыкладаў для вучобы. Прыклады гэтыя ачышчаны аўтарам ад нацыяналістычнага бруду, удасканалены ў сэнсе формы, адшліфаваны рукой майстра, які набыў за свой творчы шлях вялікі вопыт.

Дарэчы, каб не вяртацца да гэтага пытання яшчэ раз, скажам, што такая шліфоўка вершаў, напісаных раней, не з'яўляецца заганай, а, наадварот, — абавязкам пісьменніка пры перавыданнях кніг. Трэба толькі, каб аўтар агаварваў дапрацоўку сваіх вершаў. Гэта было, між іншым, зроблена тав. Бядуляй у прадмове да першага тома, але выдавецтва чамусьці аднесла яе надрукаванне ў паследуючыя тамы. Па-другое, трэба, каб пісьменнік допускаў дапрацоўку толькі тых вершаў, якія ў сваёй аснове з'яўляюцца нашымі, совецкімі, рэалістычнымі, карыснымі нам, і каб гэта «дапрацоўка» не ператваралася ў фальсіфікацыю творчасці пісьменніка, у своеасаблівую маскіроўку варожых твораў (што ў свой час культывавалася двурушнікамі і замаскаванымі нацыяналістамі ў літаратуры).

На нашу думку, варожыя творы не падлягаюць ніякай праўцы. Мы маем не мала прыкладаў, калі такі «лечаны» твор не толькі маскіруе сваю гістарычную варожую ролю, але нясе ў сабе атруту да апошніх дзён. Змітрок Бядуля, наколькі нам удалося прысачыць, прайшоў міма такой небяспекі — яго ўдасканаленні і праўкі ідуць галоўным чынам па лініі адналення тых мясцін, якія ў свой час нявечыліся ім ва ўгоду царскай цэнзуры, па лініі ўдасканалення фармальных якасцей верша. Толькі ў вельмі нязначнай колькасці выпадкаў Зм. Бядуля не ўтрымаўся, каб не змяніць змест таго ці іншага твора. У прыватнасці, гэта здарылася з вершам «Мяцежнік», які ў першай рэдакцыі не толькі названы «Волатам», але і выказвае думкі, процілеглыя сучаснаму зместу верша. Праўда, звычайны чытач, якому пападзецца ў рукі гэты томік паэзіі, нават не заўважыць падобнай праўкі, але, на нашу думку, і гэтага не варта было-б рабіць. Такія творы, якія патрабавалі кардынальнай змены ідэі, не трэба было ўключаць у том.

Гэтыя заганы тушуюцца, калі гаварыць аб агульным уражанні ад твораў Бядулі, змешчаных у першым томе. У гэтых творах Бядуля вырысоўваецца як вельмі і вельмі адароны паэт, які мае сваё, уласнае месца ў беларускай літаратуры, у яе гісторыі, які належыць да той невялікай групы, дакастрычніцкіх беларускіх пісьменнікаў, якія заўсёды будуць вывучацца, як заснавальнікі сучаснай беларускай літаратуры. Як і яны, Зм. Бядуля у свой час аддаў даніну беларускаму нацыяналізму, як і яны, пабываў ён у атручанай атмасферы «нашаніўства» і яго пазнейшых, яшчэ больш агідных і шкодных, «адраджэнцаў», як і яны, ён адалеў свае памылкі і зрывы і стаў на шлях актыўнага служэння совецкаму народу, на шлях змагання з ворагамі народа.

Аднолькавыя ўмовы існавання, аднолькавае соцыяльнае асяроддзе, якое абкружала гэтую групу пісьменнікаў, жывіла іх музу аднолькавай тэматыкай, аднолькавымі матывамі. Аднак, кожны з сапраўдных мастакоў слова меў сваё індывідуальнае месца, свой асабісты голас. Меў гэты голас і Змітрок Бядуля. Ад народна-песеннага стылю паэзіі Янкі Купалы, з яго адчаканенай гучнай мовай, Бядулю адрознівала значная культура верша, якая ішла ад кніжнасці, ад знаёмства з рускімі сімвалістамі — з іх пагоняй за формай, за настраёвасцю, нават на шкоду агульнапрынятаму значэнню слова.

Ад паэта-сімваліста М. Багдановіча Бядулю адрознівала большая чыстата і багацце мовы, большая насычанасць яго творчасці соцыяльнымі матывамі, хоць у гэтым сам Бядуля значна адставаў і ад Янкі Купалы і ад Якуба Коласа.

Ад паэзіі Якуба Коласа Зм. Бядулю адрознівала больш вобразная нагрузка яго радка, часамі большая музычнасць верша, большыя наватарскія пошукі ў форме, большая лаканічнасць, кандэнсаванасць мовы. Тое, што Зм. Бядуля, добра ведаючы народную беларускую творчасць, беларускі фальклор, мог адначасова скарыстоўваць каштоўнейшыя здабыткі яўрэйскага фальклору, — узбагачала беларускую літаратуру, пашырала яе рамкі, яе дыяпазон.

Разуменне сваёй ролі, як паэта, Зм. Бядуля выказвае ў зборніку некалькі разоў. Ён нават зборнік адкрывае праграмным вершам:

> На горне душы першы верш я каваў,
> Мне молатам гора служыла.

Гэты верш, як і перафразіроўка вядомага пушкінскага верша аб паэце — рэху грамадзянскага жыцця (гл. «Гусляр», стар. 43), вызначаў задачу паэта: будзіць свядомасць працоўных людзей, клікаць іх на барацьбу за лепшую, светлую долю.

І там, дзе Бядуля не губляў сваёй сувязі з народам, дзе ён абапіраўся на народную творчасць, на сваё веданне цяжкага жыцця селяніна,—там яго верш сапраўды клікаў да змагання за лепшую долю. Гэта мы знойдзем нават сярод імпрэсіяніцкіх «Абразкоў» 1910 года («Пастушка», «Без споведзі», «Жалоба», «За тканінай», «Шчасце не ў золаце»). Гэта мы знойдзем у значнай колькасці дакастрычніцкіх вершаў З. Бядулі, змешчаных у рэцэнзуемым томе («Ці хто забывае», «Гусляр» і інш.). Гэта найбольш каштоўныя вершы Бядулі, якія разам з цудоўнымі прыродаапісальнымі вершамі складаюць залаты фонд яго дакастрычніцкай творчасці.

Дарэчы, многія з прыродаапісальных твораў Зм. Бядулі павінны ўвайсці як прыклады, як узоры ў школьныя хрэстаматыі (напрыклад, «На раніцу з неба пакралі ўсе зоркі», «Начлежнікі пяюць», «Плача птушка ў пустыры», «Рэчка зыбіць сваю зыбку», «Вісіць серп залаты», «Зазімак», «Зімнік» і шмат іншых).

Мне здаецца, мала хто з беларускіх паэтаў умеў так добра перадаць свой настрой у пейзажным малюнку, як Зм. Бядуля, і гэтаму, між іншым, варта павучыцца ў яго нашым маладым паэтам.

Да ліку лепшых твораў Зм. Бядулі трэба аднесці многія лірычныя вершы з раздзелаў «Сілуэты» і «Настроі». Якія сілуэты вабілі вока паэта ў жыцці і прасіліся на музыку, на слова, на паперу? Перш-на-перш — сілуэты, звязаныя з маленствам паэта; вялікая сям'я бацькі («Лыжак сем — нішто цымбалы!»), сам бацька з яго сумнай хасідскай песняй, вечна заклапочаная маці, стары дзед-селянін, вартаўнік купецкага лесу на руме, сялянебазакі, потым пастушка на балоце, бацька якой забіты панам, беднячка-сялянка, якую сілком выдаюць замуж за багатага, але нямілага, нарэшце, селянін, які топіць сваё гора і крыўду ў чарцы.

Гэтыя сілуэты напісаны з вялікай цеплынёй, з глыбокім пачуццём, з вялікім жаданнем больш раднаснага, шчаслівага жыцця. Праўда, як дабіцца гэтага жыцця — паэт не ведаў. Ён гатовы быў сам плакаць з пакрыўджанымі, гатоў-бы праклінаць крыўдзіцеляў, ён называў іх — паноў і падпанкаў — ваўкамі, але такіх вершаў, як «Воўк», дзе дадзены сілуэт гінучага драпежніка, у Бядулі было мала. У гэтым сказаўся нашаніўскі палон пісьменніка.

Значна большае месца займаюць іншыя сілуэты і іншыя настроі Бядулі. І гэта зразумела. Бядуля выйшаў на літаратурную арэну, калі пануючым напрамкам у беларускай літаратуры быў сімвалізм, калі ўзначальвалі літаратурныя колы мацёрыя нацыяналісты, калі пад іх уплыў падпалі нават Купала і Колас.

Супрацьстаяць гэтаму мог толькі той паэт, які жыў-бы кроўнымі інтарэсамі рабочага класа, які-б быў звязаны з перадавой часткай рабочых — з большэвікамі. Бядуля быў далёкім ад усяго гэтага, ён падзяляў роспач інтэлігенцыі перад рэакцыяй, перад імперыялістычнай вайной. Таму тэма ночы, восені, мяцеліцы-завірухі — адна з любімых тэм Бядулі. Таму нават тэма кахання выліваецца ў Бядулі ў бязрадасныя, кволыя, хваравіта-эстэтызаваныя элегіі.

Паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца два вершы — «Ганулька» і «Свеціць месяц, б'ецца сэрца». У першым згоднае каханне Ганулі і Ягора абрываецца раптоўнай смерцю каханай: яна нахілілася над рэчкаю, каб паглядзець на свой белы твар дзявочы, «на васільковыя вочы», — і ўтапілася, быццам-бы знарок, каб даць паэту магчымасць на чулых гуслях паплакаць над лёсам кахання. У другім вершы ўпершыню закахаўшаяся Маланка чуе шэпт Янкі, які просіць яе адчыніць дзверы, але калі яна адчыняе — Янкі няма: голас Янкі ёй толькі здаўся. І гэта ў найбольш рэалістычных вершах пра каханне.

Я не кажу ўжо пра «Абразкі», у якіх аўтар забараняе дзяўчыне нават казаць слова «люблю», бо яно абражае кволае хараство сапраўднага кахання, дзе аўтар гатовы збегчы ў пустыню, каб не чуць пахвалы сваёй каханай дзяўчыне ад другіх і т. д. і т. д. Беспрадметная туга, рафініраваны эстэтызм у асобных вершах Бядулі будуць зразумелы чытачу толькі ў разрэзе гісторыі беларускай літаратуры, як праява сімвалізма.

У гэтым-жа разрэзе чытач успрыме і раздзел «Вайна», асабліва, калі яго чытаць у першай рэдакцыі. Як Купала і Колас, так і Бядуля ўспрыняў вайну, як стыхійную бяду, якая звалілася на чалавецтва за грахі і правіннасці ва ўсякім разе не беднаты, не сялянства. Як Купала і Колас, так і Бядуля часамі даходзіў да думкі, што тыя, за каго вялася вайна, знаходзяцца ў палацах, а тыя, хто ваюе, толькі ашуканыя працоўныя. Аднак, далей мары, што вайна хутка скончыцца і, можа, прынясе нацыянальнае вызваленне, далей заклiку ненавідзець «шатана смерці», шалёнага «юду вайны» — Бядуля не ішоў.

Некалькі раздзелаў, прысвечаных соцыялістычнаму будаўніцтву, і асабліва раздзел «Чырвона-чорная жалоба» яскрава паказваюць, што паэтычныя здольнасці Бядулі не толькі не паслаблі ў сувязі з яго адыходам ад сімвалізма, а, наадварот, далі яго гучнай паэтычнай форме патрэбны ёй глыбокі змест. Праўда, у радзе вершаў мы гэтага не знаходзім (напрыклад, у «Прыгожых машынах»), бо пісаліся яны тады, калі Бядуля займаў двайстую пазіцыю: з аднаго боку яго трымалі ў палоне нацыяналісты, а з другога боку ён не мог не адчуваць, што праўда, сіла і будучае знаходзіцца ў руках пролетарыята. Але прачытайце такія рэчы, як «Заходняя Беларусь», «З палаючых кватоў-агнішчаў», «Маладой гвардыі», «Шляхі», вершаваныя аповесці «У ясных крушнях» і інш., прыслухайцеся да жалобных акордаў, да глухіх, абрываючыхся радкоў «Чырвона-чорнай жалобы» — і вы ўбачыце, што той, хто раіў Бядулі абарваць сваю паэтычную творчасць, даваў свядома злачынную параду. Гэта можна сказаць з тым большай упэўненасцю, калі ўспомніць празаічныя творы Зм. Бядулі з іх цёплымі лірычнымі адступленнямі, якія і ў Бядулі — празаіку выдаюць паэта, прычым паэта-лірыка значнай сілы і значнага таленту.

Нарэшце, варта адзначыць, што рад раздзелаў тома прысвечан гісторыі Беларусі і беларускай міфалогіі, якія таксама прачытаюцца з вялікай ахвотай, бо там Бядуля пераклаў у вершы сапраўдную народную творчасць і пераклаў з вялікім мастацкім густам. Наогул трэба сказаць, што багацейшая міфалогія беларускага народа яшчэ патрабуе свайго даследчыка. Казкі, апавяданні, песні доўгі час замянялі народу сучасныя паэмы, вершы, раманы, п'есы. Яны даносілі да маладога пакалення мудрасць і жыццёвы вопыт старэйшых, мудрасць і вопыт продкаў, народную мудрасць. Многія з гэтых апавяданняў, казак скарачаліся да пагаворак, прымовак, другія адшліфоўваліся ў класічныя навелы, песні.

Адна з велізарнейшай карыснасці задач заключаецца ў тым, каб сабраць усё найлепшае, што стварыў народ, што ён давёў да майстэрства, да дасканаласці, і зрабіць гэта здабыткам нашых сучаснікаў. Гэта будзе мець цікавасць не толькі, як гісторыя, як мінулае, — гэта знойдзе сваё прымяненне ў сучасным: новая соцыялістычная культура будуецца на ўсіх здабытках чалавецтва папярэдніх эпох і асабліва на дэмакратычных здабытках народа. З гэтага пункту погляду мы адабраем тую работу, якую правёў Бядуля, апрацоўваючы свае «Палескія байкі».

Мы, зразумела, не можам згадзіцца з такім вызначэннем Зм. Бядуляй сваёй ролі, як паэта, якое ён дае ў працівавагу двойчы падкрэсленаму грамадска-палітычнаму кірунку сваёй паэзіі.

> Я — спадчына вякоў, сын даўніх пакаленняў,
> Я — быстралётны цень тысячалетніх ценяў,
> Я — хутканогі блеск ранейшых мігаценняў,
> Я — тку далей узор — няскончанай тканіны,
> Я — непрыкметны плынь стардаўных ручаінаў і т. д.;

бо адгэтуль просты шлях да ідэалізацыі ўсякай старасветчыны, да сцвярджэнняў аб адзіным патоку беларускай культуры і т. д. Змяшчэнне гэтага верша з'яўляецца памылкай, таму што ні другая палова верша, ні надрукаваныя праз тры старонкі радкі:

> Я—кропля вялікага творчага мора,
> Я—іскра квяцістага полымя зораў,—

не знішчаюць няправільнай установкі, дадзенай у першым вершы. Гэты верш, на нашу думку, мог з'явіцца толькі ў выніку недагляду рэдактара і можа быць цярпімы толькі тады, калі прысвяціць яму тлумачэнне пра няправільнасць палітычных і літаратурна-палітычных пазіцый, якія займаў Зм. Бядуля ў часе напісання гэтага верша.

Падагульваючы ўсё вышэйсказанае, трэба прызнаць, што з'яўленне кніжкі паэзіі Змітрака Бядулі больш чым своечасовае і вельмі карыснае. Яна з вялікай ахвотай будзе прынята нашымі чытачамі. Задача нашай крытыкі на бліжэйшы час — даць дасканалы разгляд паэтычнай творчасці Бядулі, бо яшчэ раз кажу, — Бядуля, як паэт займае вельмі пачэснае месца ў нашай літаратуры. Гэта месца патрабуе ад Зм. Бядулі прадаўжвання работы на паэтычным фронце, каб «Збор твораў» узбагаціўся новым томам паэзіі, прысвечанай нашаму пераможнаму соцыялістычнаму будаўніцтву. Мы-б гэтага ад душы жадалі.

М. КЛІМКОВІЧ.

А. І. ПАЛЕЖАЕЎ

(ДА СТАГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ)

28 студзеня споўнілася 100 год з дня смерці таленавітага рускага паэта, страснага змагара супроць самадзяржаўя і прыгоннага права — Аляксандра Іванавіча Палежаева.

Гісторыя жыцця і лёсу Палежаева — адна з самых трагічных і патрасаючых у гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Расіі.

Будучы студэнтам маскоўскага ўніверсітэта, А. І. Палежаеў у 1825 годзе напісаў паэму «Сашка», у якой галоўны герой з такімі словамі звяртаецца да Расіі:

Но ты, козлинными брадами
Лишь пресловутая земля,
Умы гнетущая цепями,
Отчизна глупая моя!
Когда тебе настанет время
Очнуться в дикости своей,
Когда ты свергнешь с себя бремя
Своих презренных палачей?

Гэта паэма, накіраваная супроць урада, разышлася ў вялікай колькасці спісаў, як падпольная літаратура.

28 ліпеня 1826 г. роўна праз 15 дзён пасля кары смерцю дзекабрыстаў, паэма гэта трапіла ў рукі самога цара Нікалая І.

Вялікі пісьменнік-публіцыст А. І. Герцэн у сваіх бяссмяротных мастацкіх мемуарах «Былое і думы» са слоў самога Палежаева расказвае, што аднойчы ўначы Палежаева прама з пасцелі даставілі ў габінет Нікалая.

«Калі студэнт пераступіў парог царскага габінета, Нікалай кінуў на ўвайшоўшага выпрабоўваючы позірк, у руцэ ў яго быў сшытак.

— Ці ты, — спытаўся ён, — склаў гэтыя вершы?

—Я, — адказаў Палежаеў.

— Вось, князь, — працягваў гасудар, — вось, я вам дам узор універсітэцкага выхавання, я вам пакажу, чаму навучаюцца там маладыя людзі.

— Чытай гэты сшытак уголас, — дадаў ён, звяртаючыся зноў да Палежаева.

Хваляванне Палежаева было такое моцнае, што ён не мог чытаць. Позірк Нікалая нерухома спыніўся на ім. Я ведаю гэты позірк і ні аднаго не ведаю страшней, безнадзейней гэтага шэрабескалярова́га, халоднага алавянага позірка.

— Я не магу, — сказаў Палежаеў.

— Чытай! — закрычаў высачайшы фельдфебель.

Гэты крык вярнуў сілу Палежаеву, ён разгарнуў сшытак. «Ніколі, — гаварыў ён, — я не бачыў «Сашку» так перапісанага і на такой добрай паперы».

Спачатку яму было цяжка чытаць, потым, натхняючыся больш і больш, ён голасна і жвава дачытаў паэму да канца. У мясцінах, асабліва рэзкіх, гасудар рабіў знак рукой міністру. Міністр заплюшчваў вочы ад жаху.

— Што скажаце? — запытаўся Нікалай па заканчэнні чыткі.

— Я пакладу канец гэтай распусце! Гэта ўсё яшчэ сляды, апошнія рэшткі: я іх знішчу! Якіх ён паводзін?

Міністр, зразумела, не ведаў яго паводзін, але ў ім ачнулася штосьці чалавечае, і ён адказаў:

— Надзвычай добрых паводзін, ваша вялічаства.

— Гэты водгук цябе выратаваў, але пакараць цябе неабходна для прыкладу другім. Хочаш у ваенную службу?

Палежаеў маўчаў.

— Я табе даю сродак ваеннай службай ачысціцца. Што-ж, хочаш?

— Я мушу падпарадкавацца, — сказаў Палежаеў.

Гасудар падышоў да яго, паклаў руку на плячо і сказаў:

— Ад цябе залежыць твой лёс, калі я запамятаю, ты можаш мне пісаць, — пацалаваў яго ў лоб». (**Герцэн,** «Былое і думы», т. І, стар. 135—136).

Пацалунак Нікалая быў пацалункам Іуды, якім былі «ўзнагароджаны» і многія дзекабрысты.

Маладога Палежаева, згодна распараджэння Нікалая, спачатку прызначылі ўнцер-афіцэрам, затым разжалавалі ў салдаты, дадзена было строгае распараджэнне «меци яго пад самым строгім наглядам і пра паводзіны яго штомесячна дапасіць начальніку Галоўнага штаба яго вялічаства».



Іменна з гэтага моманту пачалося прыгнечанае, цяжкое, пакутлівае жыццё салдата-палітыка, паэта-бунтаўшчыка, жыццё, поўнае нястач і адчаю, жыццё, поўнае вялікіх няшчасцяў, зняваг і здзекаў.

Разгром дзекабрысцкага руху і зверская расправа Нікалая І з яго ўдзельнікамі і правадырамі паклалі пачатак доўгай эпохі чорнай, глухой рэакцыі.

Усе жывыя і ўсе мыслячыя сілы краіны, усе сумленныя найбольш прагрэсіўныя элементы рускага грамадства былі разлаўлены, задушаны, знішчаны.

Цяжкі, трагічны лёс Палежаева быў агульным сацыяльным лёсам для рэвалюцыянераў-адзіночак 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Творчасць гэтага таленавітага паэта дыхала вялікай страсцю і нянавісцю да цара, да ўсіх тых, хто прыгнечваў і падаўляў свабодную думку, хто адбіраў у чалавека ўсё, асуджаючы яго загадзя на верную гібель.

Аляксандр Іванавіч Палежаеў да канца свайго жыцця захаваў глыбокую нянавісць да самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу.

У выдатным творы «Арыштант» Палежаеў у такіх гнеўных радках абвінавачвае Нікалая І:

О ты, который возведен
Погибшей вольностью на трон,
Или, простее говоря,
Особа русского царя.
. . . .
Поймешь-ли ты, что царский долг
Есть не душить, как лютый волк,
По алчной прихоти своей
Мильоны страждущих людей.
Второй Нерон, Искарнот,
Убийца Братьев и народа...

А яго палітычныя памфлеты прама накіраваны супроць цара.

В России чтут
Царя и кнут;
В ней царь с кнутом
Как поп с крестом... —

піша паэт у вершы «Чатыры нацыі» і гнеўна ўсклікває:

И Русь, как кур, передушил
Ефрейтор-император!

Гэтыя словы здзіўляюць чытача сваёй паэтычнай сілай, гнеўнасцю і бясстрашнасцю.

10 год прабывання Палежаева ў салдацкім шынелі зблізілі паэта з народам.

У 1828 годзе Палежаеў напісаў у стылі салдацкіх песень верш «Зноў нешта», у якім прама і рашуча выказаў пагрозу цару — ужо ад імя салдацкіх мас:

Православный наш царь,
Николай государь,
В тебе мало добра!
Обманул, погубил
Ты мильоны голов —
Не сдержал, не свершил
Императорских слов.
. . . .
Так умри-же теперь,
Православный наш царь
Николай государь.
Ты болван наших рук:
Мы склеили тебя
И на тысячу штук
Разобьем, разлюбя!

Пратэст, глыбокая нянавісць да царскага самаўладства, мары аб перамозе над ім, — вось што натхняла паэта, якому самадзяржаўе прынесла казарму, каземат і цяжкое жыццё ў салдацкім шынелі.

Аляксандр Іванавіч Палежаеў быў паэтам палітычнай лірыкі.

У сваёй мастацкай творчасці ён прадаўжаў традыцыі рэвалюцыйнай і свабодалюбівай паэзіі Рылеева, Пушкіна. Гэтыя слаўныя традыцыі знайшлі свой поўны і ўсебаковы выраз у творчасці вялікага народнага паэта Нікалая Аляксеевіча Некрасава.

У адным з сваіх вершаў «Песня палоннага ірокезца» Аляксандр Палежаеў якбы выразіў упэўненасць у помсце і перамозе над самаўладствам:

Совокупной толпой
Мы на землю сойдем
И в родных раздольем
Пыл вражды боевой:
Победим, поразим
И врагам отомстим.

Значэнне творчасці Палежаева ў гісторыі рускай паэзіі велізарнае.

Палежаеў быў адным з нямногіх паэтаў, хто пасля разгрому дзекабрскага руху не спыняў адкрыта і рашуча выказваць сваю нянавісць да прыгняіальнікаў народных мас, хто ў вершах вялікай паэтычнай сілы і энергіі апяваў мужнасць і цвёрдасць, неабходныя сапраўднаму рэвалюцыянеру.

Вось чаму з вялікай павагай выказваліся аб ім Белінскі і Дабралюбаў, называючы яго «смелым змагаром» з «грамадскімі няспраўядлівасцямі і людскімі забабонамі».

Сто год таму назад нікалаеўская рэакцыя ўсім цяжарам навалілася на надзвычайнага чалавека, паэта-бунтара, убачыўшы ў яго творчасці «сляды» разгромленага дзекабрскага паўстання.

Чорная рэакцыя Нікалая І праследвала і цкавала маладога таленавітага паэта, яна яго калечыла і яна-ж звяла яго ў магілу.

Але не ў сілах была яна загасіць у ім рэвалюцыйную нянавісць да самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу, не ў сілах была яна загасіць у ім глыбокую любоў да прыгнечаных народных мас. За гэту нянавісць да прыгнятацеляў і за палкую, вялікую любоў яго да прыгнечаных мас працоўнага народа шануе сёння совецкі народ памяць свайго таленавітага паэта.

А. МАСЛОЎСКІ.

КАНЦЭРТЫ СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА ЦДЧА імя ФРУНЗЕ

Сімфанічны аркестр ЦДЧА імя Фрунзе ў гэтым годзе спраўляе слаўны юбілей—дзесяцігоддзе свайго існавання. У 1928 годзе пры ЦДЧА быў арганізаваны пад кіраўніцтвам інспектара ваенных аркестраў тав. С. А. Чарнецкага сімфанічны аркестр у складзе 40 чалавек. Зараз у аркестры 64 чалавекі: мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжэр яго —народны артыст рэспублікі ордэнаносец Л. П. Штэйнберг.

Аркестр складаецца з моладзі, пераважна з чырвонаармейцаў тэрміновай службы. Такім чынам аркестр штогод мяняе свой склад.

Асноўная задача аркестра—абслугоўванне чырвонаармейскіх часцей. Аркестр неаднаразова бываў на перыферыі—на Далёкім Усходзе, у Забайкаллі, у Закаўказзі, у Ленінградзе і інш. Акрамя абслугоўвання чырвонаармейскіх часцей, аркестр дэманструе ўзоры музычнай літаратуры і ў рабочай аўдыторыі. За дзесяцігадовы тэрмін існавання аркестр, пры 15 выступленнях у месяц, даў каля 1800 канцэртаў.

Рад твораў совецкіх аўтараў дэманстраваўся аркестрам упершыню, напрыклад: «Пятая сімфонія» Кніпера, «Марыйская сюіта» Ракава, сімфанічная паэма для сімфанічнага і духавога аркестраў і хора «Красная плошча» Штэйнберга, «Кабардзіна-балкарская рапсодыя» Шэхцера, «Украінская сюіта» Кочэтава і рад іншых. У рэпертуары аркестра сімфоніі Гайдна, Моцарта, Бетховена, Шуберта, Мендэльсона, амаль усе сімфанічныя творы Рымскага-Корсакава, Глінкі, усе сімфанічныя уверцюры і фрагменты з опер Вагнера, прыгодныя для выканання на сімфанічнай эстрадзе, «Багатырская сімфонія» Барадзіна, пятая сімфонія з «Новага свету» Дворжака і амаль увесь сімфанічны рэпертуар совецкіх аўтараў.

Паказаная аркестрам пад кіраўніцтвам дырыжэра В. С. Смірнова праграма сведчыць аб выдатнай якасці аркестра, аб яго вялікіх выканаўчых магчымасцях. Асноўная рыса гэтага аркестра—непасрэднасць, смеласць, яркасць выканання. Агульная гучнасць аркестра моцная, сакавітая. Бліскучыя асобныя групы аркестра, напрыклад, медна-духавая, могуць суперніцаць з лепшымі аркестрамі Саюза.

Спявачка, артыстка Пяцісоцкая, якая ўдзельнічала ў аркестры, добра выканала песню Леля з оперы «Снягурачка» Рымскага-Корсакава, раманс Паліны з оперы «Пікавая дама», раманс Чайкоўскага «Кабы знала я, кабы ведала» і раманс Рахманінава «Не пой красавица». Характэрная рыса ў выкананні гэтай артысткі—добрая, мяккая лірыка і культура. Чыста вакальным недахопам з'яўляецца няроўнасць рэгістраў. Кожны рэгістр мае свой тэмбр.

Саліст-канцэртмейстар Баравік, які выканаў 1-ю частку канцэрта для скрыпкі Чайкоўскага, пакінуў двайстае ўражанне. Скрыпач з надрэннай тэхнікай, Баравік зусім ігнаруе мастацка-музыкальны бок выступлення. Гэтая акалічнасць вядзе да далёка няпоўнацэннага выканання канцэрта Чайкоўскага. Валодаючы не надта цікавым, некалькі грубым, плоскім гукам, не заўсёды ўстойлівай інтанацыяй, Баравік зусім не ўмее фразіраваць. Музыкальная фраза ў Баравіка пазбаўлена выразнасці рухаў, кульмінацыі, уздыму і спаду.

Звяртаючыся да аркестра, хацелася-б яшчэ спамянуць аб некаторай непрапарцыянальнасці ў яго складзе. Пры патройным складзе духавых інструментаў дзесяці першых і дзевяці другіх скрыпак безумоўна мала, што і адбілася на якасці выканання, бо драўляныя і медныя духавыя групы ўвесь час заглушалі струнную групу.

А. ДЭМБО.



«... У хвост і ў грыву».

Малюнак маст. Кукрыніксы.

ВЕЧАР ШОТА РУСТАВЕЛІ

27 студзеня ў будынку Тэатра Юнага Гледача адбыўся вялікі агульнагарадскі вечар, прысвечаны 750-годдзю з дня напісання паэмы вялікага грузінскага пісьменніка Шота Руставелі.

Вечар адкрыў пісьменнік М. Лынькоў, які адзначыў у сваім уступным слове, што юбілей Шота Руставелі з'яўляецца інтэрнацыянальным святам, што імя Шота Руставелі дарагое і блізкае не толькі грузінскаму народу, але і ўсім народам вялікага Совецкага Саюза.

З дакладам аб Шота Руставелі выступіў крытык В. Гольцаў.

Народны паэт рэспублікі Якуб Колас прачытаў свой верш, прысвечаны Шота Руставелі. З уражаннямі аб паездцы ў Грузію на руставелеўскія дні выступілі пісьменнікі Броўка і Глебка, якія прачыталі таксама ўрыўкі з паэмы «Віцязь у тыгравай шкуры», перакладзеныя імі на беларускую мову, з чыткай перакладаў выступілі таксама пісьменнікі Крапіва, Агняцвет і Камянецкі.

У ПАЭТЫЧНАЙ СЕКЦЫІ ССПБ

26 студзеня ў Доме пісьменніка адбылося абгаварэнне творчасці маладога паэта А. Жаўрука. З дакладам выступіў тав. Бярозкін, які побач з недахопамі многіх вершаў А. Жаўрука, што ідуць галоўным чынам па лініі пераймання іншых паэтаў і агульна-гістарычнага вырашэння ўзятых тэм, адзначыў, як заслугоўваючую сур'ёзнай увагі паэму «Крывёю сэрца», дзе аўтар дае вобраз гераічнай іспанскай дзяўчыны, якая змагаецца з фашыстамі.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы Глебка, Клімковіч, Куляшоў, Цітоў, Шарапаў, Кучар і Броўка таксама адзначылі, што паэма «Крывёю сэрца» з'яўляецца творчым дасягненнем маладога паэта.

У сваім выступленні А. Жаўрук падзякаваў таварышоў за крытыку і заявіў, што абгаварэнне яго творчасці паслужыць яму на карысць.

Гэты сход паэтычнай секцыі з'явіўся першым сходам, на якім было пастаўлена творчае пытанне. Абгаварэнне рукапісаў павінна стаць адным з дзейсных мерапрыемстваў у далейшай рабоце секцыі.

Ал. Аст.

З поваду артыкула „Ачысціць Белдзяржкіно ад контррэволюцыйнага ахвосця“

6 жніўня 1937 года ў нашай газеце быў змешчан артыкул — справаздача аб нарадзе кінопрацаўнікаў БССР—«Ачысціць Белдзяржкіно ад контррэволюцыйнага ахвосця». Супрацоўнік газеты С. Нортман абвінаваціў у гэтым артыкуле тав. Брадзянскага ў авантурызме. Праверкай устаноўлена, што абвінавачанне гэта не адпавядае сапраўднасці і з'яўляецца вымыслам карэспандэнта, які ўвёў рэдакцыю ў заблуджэнне.

С. Нортман зняты з работы ў рэдакцыі.

Выказваем сваё глыбокае спачуванне мастаку БАРЫСУ МАЛКІНУ з прычыны заўчаснай смерці яго жонкі МАРЫІ АЛЕКСАНДРАЎНЫ.

З. Бядуля, П. Броўка, М. Лынькоў, К. Крапіва, Г. Камянецкі, А. Кучар, К. Чорны, М. Тэйф.

„МЕНАХЕМ-МЕНДЛ“ У ЯЎРЭЙСКІМ ТЭАТРЫ

Яўрэйскі тэатр пачаў работу над творамі выдатнага яўрэйскага пісьменніка класіка Шолам-Алейхема ў такі час, калі калектыў тэатра стаў на шлях барацьбы супроць рэшткаў варожых фармалістычных і нацыяналістычных уплываў, супроць мейерхольдаўшчыны, скажэння і апашлення класікі, вельмі моцна бытаваўшых у гэтым тэатры ў недалёкім мінулым і яшчэ канчаткова не зжытых дагэтуль.

Тэатр зрабіў зусім правільна, калі тэмай першага спектакля шолам-алейхемаўскага цыкла абраў «Менахем-Мендля», таму што «Менахем-Мендл» — цэнтральны вобраз, створаны Шолам-Алейхемам, майстрам гумарыстычнай навелы і камедыі, і таму што «менахем-мендлізм»—асноўны тэматычны стрыжань пераважнай большасці твораў класіка.

Асновай спектакля з'явілася навелістычная аповесць Шолам-Алейхема, пабудаваная па «Перапісцы Менахем-Мендля з жонкай Шэйнэ-Шэйндл». На фоне жудасных сацыяльна-палітычных і эканамічных умоў, створаных для яўрэйскай беднаты ў рысе аселасці царскім ладам, Шолам-Алейхем разгортвае выразны на гэтай глебе буйны гумарыстычны вобраз «чалавека паветра» Менахем-Мендля, які па праву можа быць аднесены да галерэі выдатнейшых камедыйных вобразаў рускай і сусветнай літаратуры.

Безгрунтоўны лятуценнік і аптыміст, не маючы ніякай прафесіі і адукацыі, захоплены ідэяй лёгкага і хуткага ўзбагачэння, марамі пра паветраныя палацы, Менахем-Мендл блукае ў свеце нязбытачных ілюзій і рызыкоўных авантур. У пошуках «яўрэйскага шчасця», ён з Касрылаўкі імчыцца ў Одэсу, Кіеў (Егупец), удзельнічае ў біржавых спекуляцыях і пасрэдніцкіх здзелках.

Усе этапы такой «дзейнасці» праходзіць Менахем-Мендл, гандлюючы цукрам, лесам, маёнткамі, дамамі, нафтай. Ён становіцца пасрэднікам у шлюбных справах — «шадхенам», паспрабаваўшы перад тым свае сілы і ў журналістыцы. Пацярпеўшы апошнюю няўдачу ў страхавой агентуры, Менахем-Мендл едзе ў Амерыку, зноў-жа за «золатам... якое валяецца пад нагамі».

Апошняе пісьмо жонцы ён з нязменным аптымізмам заканчвае парадай: «Не гараваць і не прымаць блізка да сэрца непрыемнасці. Бо — вялік наш бог». Балзёрасць духу, непахісны, хоць і безгрунтоўны, аптымізм не пакідаюць Менахем-Мендля на ўсім шляху яго выпрабаванняў і цяжкіх прыгод.

Пачаўшы сваё першае пісьмо жонцы з Одэсы тым, «што золата тут на вуліцах валяецца», ён, не гледзячы на «трыццаць тры» перажытых ім няшчасці і няўдачы, з той-жа жыццёрадаснасцю і аптымізмам едзе ў Амерыку, за золатам, не растраціўшы веры ў магчымасць лёгкага ўзбагачэння.

У непахіснай упэўненасці Менахем-Мендля ў шчаслівым завяршэнні яго нязбытачных ілюзій, у пастаянным аптымістычным тонусе — квінтэсенцыя выдатнага камедыйнага вобраза. Вобраз Менахем-Мендля разам з тым і трагічны, але трагізм яго заключаецца ў тым, што сам Менахем-Мендл не разумее і не адчувае безвыхаднасці свайго становішча. Рознастайнасць фарбаў і нюансаў, глыбокая мысль, якімі Шолам-Алейхем малюе вобраз, робяць яго тыповым характарам, абагульняючым вялікую сацыяльную праслойку ў мястэчковым насельніцтве пачатку дваццатага стагоддзя.

Аўтар інсцэніроўкі С. Олендэр абраў асновай для драматычнага твора «Кнігу V» пісем Менахем-Мендля да жонкі Шэйнэ-Шэйндл пад назвай «Не вязе», імкнучыся перадаць атмасферу ўсяе аповесці.

Сюжэтнай асновай інсцэніроўкі Олендэр абраў няўдалы рэйд Менахем-Мендля ў «шадхены». З мноства прыгод, якія адбыліся з гэтым «чалавекам паветра», аўтар інсцэніроўкі мімаходзь закрануў толькі яго спробы «друкавацца на газетах», адкінуўшы ўвесь вялікі папяровы шлях Менахем-Мендля, дынаміку развіцця вобраза, а таксама і яго апошні рэйд у страхавую агентуру.

Натуральна, што такі, хоць часткова і вымушаны, прыём інсцэніроўкі значна абяскровіў выдатны вобраз, так сказаць, абкарнаў і абяскрыліў яго, зрабіўшы вобраз статычным.

Шырыню размаху, незвычайную рухавасць і лёгкасць, імклівы азарт Менахем-Мендля Олендэр, па сцэнічных меркаваннях, замкнуў у дзве «сцэнічных кропкі» — гасцініцу і кватэру Кімбака.

Каларыстычным і жанравым статычным сцэнам у гасцініцы ў інсцэніроўцы аддадзены два акты з трох. Атмасфера аповесці аказалася ў значнай меры выхалашчанай і рашчыненай у бытавых сітуацыях. Парушэнне дынамічнага стылю пісьма Шолам-Алейхема ёсць у радзе асобных сцэн і вобразаў.



«Менахем-Мендл» у Яўрэйскім Дзяржтэатры. НА ЗДЫМКУ: артыст А. Трэпель у ролі Менахем-Мендла.

Калі «сон Менахем-Мендля» сваёй дынамікай і эмацыянальна-сэнсавай нагрузкай у нейкай меры экспазіруе ілюзорнае ажыццяўленне мар Менахем-Мендля, то вадэвільная канцоўка трэцяга акта і фінальны маналог Менахем-Мендля выбіваюцца са стылю камедыі — першая лёгкадумна-танным забаўляльным зместам, а маналог трагізмам становішча, неўласцівым свядомасці Менахем-Мендля.

Тое самае атрымалася з новымі персанажамі.

Калі ямпольскі яўрэй у нейкай ступені ўзмацняе каларыт менахем-мендлізма, з'яўляючыся «чалавекам паветра» у «ямпольскім маштабе», то хатняя работніца Злата выпадае з усёй канцэпцыі шолам-алейхемаўскага твора сваёй падкрэсленай дэманстрацыяй пратэсту супроць усіх гаспадароў і ў прыватнасці эксплаататараў Кімбакаў. Гэта ў той час, калі Шолам-Алейхем называе іх ветлівымі, скромнымі і душэўнымі людзьмі.

Такім чынам няўдачы ў інсцэніроўцы ідуць пераважна па лініі няпоўнацэннасці цэнтральнага вобраза — Менахем-Мендля, аднабокасці раскрыцця тэмы менахем-мендлізма і некаторай ласкутнасці кампазіцыі.

Спектакль яўрэйскага тэатра (пастаноўшчык М. Сокал, мастак М. Аксельрод) адлюстраваў як дадатныя, так і адмоўныя бакі інсцэніроўкі. Аднак галоўнай дадатнай рысай першай самастойнай работы маладога рэжысёра Сокала з'яўляецца ўвага да актора, у процілегласць фармалістычнаму адмаўленню самастойнай ролі актора, якое асабліва характэрна было раней для Яўрэйскага тэатра і яго варожага кіраўніцтва.

З мастацкім густам зроблены ў спектаклі жанравыя і бытавыя сцэны, у прыватнасці сцэна ў доме Мойшэ-Нісл Кімбака. З тэмпераментам пастаўлен сон Менахем-Мендля. Рэалістычна сакавіта абмалёваны Мойшэ-Нісл, Бэйле-Лэя і Сонечка Кімбак.

Рэалістычныя дэкарацыі, вопратка і грым Аксельрода, вельмі маляўнічыя і выразныя ў кантрастных фарбах, стварылі добры ўнешні фон для камедыі, таксама як музыка Туранкова і яўрэйскія народныя танцы ўзмацнілі эмацыянальныя фарбы спектакля.

Няўдачай рэжысёра з'яўляецца мітуслівая канцоўка спектакля, ад якой аддае танным зубаскальствам. Зусім непатрэбны натуралістычны працяглы ўсеагульны храп, якім пачынаецца спектакль, нудная вазня з клапамі, бессэнсоўная сварка гаспадароў гасцініцы. Але галоўным, прынцыповым недахопам спектакля з'яўляецца адсутнасць правільнага раскрыцця вобраза Менахем-Мендля, цэнтральнай фігуры спектакля і носьбіта яго асноўнай ідэі. Інтэрпрэтацыя Менахем-Мендля пайшла па бакавой, другараднай лініі. Гэта лепш за ўсё прасачыць на выкананні ролі Менахем-Мендля артыстам Трэпелем.

Нельга адмовіць Трэпелю ў тым, што ён іграе цікава. Ілюзія паветраных палацаў, мільганне мільёнаў Ракфелера, Бродскага бударажаць мозг Менахем-Мендля. Нервовая ўзбуджанасць актора змяняецца жаласлівым лірызмам і сумам пры ўспаміне аб жонцы і дзецях і ў цэлым радзе іншых сітуацый. Так здарылася, што жаласліва-лірычныя інтанацыі, пакорнасць лёсу сталі дамінуючымі эмацыянальнымі фарбамі вобраза. Нават поўны надзей на шчаслівае завяршэнне сваёй шадхенскай місіі, Менахем-Мендл—Трэпель—губляецца і хаваецца за люстэрка пры першай сустрэчы з Мойшэ-Нісл Кімбакам. Ён жаласлівы і пакорны перад тварам «шадхенаў» рэб Ошэра і Лебельскага. Ён нават пакорны і бездапаможны перад выпадковым ямпольскім яўрэем. Ён нікчэмны і разгублены ў сутыкненні з шадхенскім воўкам рэб Ошэрам у фінальнай сцэне краху шлюбнага пасрэдніцтва.

Разам з тым, ён больш разумны і свядомы, больш добры і разважлівы, чым сапраўдны «чалавек паветра» Шолам-Алейхема.

Няма ў партытуры Трэпеля галоўнай магістралі, так сказаць, жыццёвай філасофіі шолам-алейхемаўскага Менахем-Мендля — невычэрпнай жыццёрадаснасці, ўсё паглынаючага, хоць і безгрунтоўнага, аптымізма. Няма і той непахіснай упэўненасці яго, што незе ўсё-ж такі «валяецца на вуліцы» золата, якое ён здабудзе, той упэўненасці, якая дае сілу насіць няшчасную галаву на плячах. Нейкі надрыў і пячатка стомленасці агортваюць чало Менахем-Мендля — Трэпеля з першага выхаду на сцэну і да апошняга маналога. Трагізм лёсу Менахем-Мендля пры капіталістычным ладзе даносіцца тэатрам да гледача не праз спецыфічны гумар Шолам-Алейхема, а шляхам больш спрошчаных, прасталінейных, заштампаваных прыёмаў.

Захапляючыся таленавітай ігрой артыста Трэпеля, мы адпак рашуча выказваем сваю прынцыповую нязгоду з такой абяскрыленай інтэрпрэтацыяй выдатнага вобраза.

Тэма менахем-мендлізма ў яе рознавіднасцях развіта і ў вобразах Шлоймэ «муцлэх» (нешчаслівы), «шадхенаў» рэб Ошэра, Лебельскага і ямпольскага яўрэя—людзей, якія жывуць светаадчуваннем і ідэаламі Менахем-Мендля. Шлоймэ «муцлэх» — адну з крайніх рознавіднасцяў Менахем-Мендля,—удумліва іграе артыст Лімон. Ён надзвычайна ярка ахарактарызаваны самім Шолам-Алейхемам. Ад аднаго позірку Шлоймэ нават «рыбы дохнуць у рэчцы». Адсюль і адчай, і песімізм, і асуджанасць Шлоймэ, што перададзена актарам у панікла́й постаці і сумных інтанацыях.

Лейба Лебельскі (арт. Левін) і рэб Ошэр (арт. Моін) раскрыты ў кантрастных фарбах, як процілеглыя характары. Безпапаможны, разгублены, жалкі і нервова ўзбуджаны Лебельскі ў выкананні арт. Левіна кантрастуе з самаўпэўненым, нахабным, рухавым і хітраватым рэб Ошэрам, якога каларытна і выразна іграе Моін. Аднак, і Моін і Левін, захапляючыся ўнешнімі момантамі роляў, пачынаюць пераігрываць. Моін захапляецца досыць танным трукам абыгрывання сваёй доўгай барады, а Левін — доўгім нудным «мычаннем».

Тып «маленькага» Менахем-Мендля стварыў арт. Бродкін, іграючы ямпольскага яўрэя некалькі аднастайна.

Мойшэ-Нісл Кімбак (арт. Фельдман) ахарактарызаваны Шолам-Алейхемам, як «ветлівы і душэўны» чалавек. У такой інтэрпрэтацыі іграе гэтую ролю Фельдман, надзяляючы вобраз выразнымі бытавымі штрыхамі і каларытным танальным малюнкам.

Сонечка, дачка Кімбака, у выкананні арт. Фрыдман — сталая, дародная маладая жанчына, якая авалодала ўнешнім бокам адукаванасці і ганарыцца гэтым. Манернасць інтанацый і рухаў, халодны, абыякавы твар складаюць трапны малюнак вобраза правінцыяльнай барышні. Артыстка Каплан, якая цёпла і стрымана іграе «ціхую і скромную» Бэйле-Лэю, часам парушае гэты шолам-алейхемаўскі малюнак вобраза сварлівым тонам, якім яна ўшчыхамірвае Мойшэ-Нісла.

Невыразная ў інсцэніроўцы гаспадыня гасцініцы, абмежаваная вузка бытавой функцыяй у спектаклі, не дала артыстцы Герцберг матэрыялу для стварэння закончанага вобраза. Тым не менш, неабходна падкрэсліць абаяльнасць артысткі, жывасць і выразнасць дыялага, які яна вядзе з Менахем-Мендлем — Трэпелем. Не пакідае цэльнасці ўражання ігра арт. Шыка ў малазначнай ролі гаспадара гасцініцы. Глухата і сварлівае бурчанне — недастатковыя элементы для стварэння мастацкага вобраза. Жыва, але некалькі мітусліва іграе арт. Альтман эпізадычную ролю прыслугі Златы.

***

Заканчваючы агляд спектакля, у якім ёсць рэжысёрскія і акторскія ўдачы, мы павінны адзначыць, што галоўная лінія Менахем-Мендля, філасофія гэтага выдатнага вобраза тэатрам па-сапраўднаму не раскрыты. Бытавая статычная лінія часта засланяе сабой гумарыстычна-дынамічны твор выдатнага пісьменніка. Тэатру не ўдалося стварыць поўнацэннага шолам-алейхемаўскага спектакля.

Мы спадзяемся, што пры больш глыбокім і сур'ёзным падыходзе да вялікага яўрэйскага класіка Яўрэйскі тэатр здолее стварыць высокамастацкі шолам-алейхемаўскі спектакль.

М. МОДЭЛЬ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня газеты «Звязда». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 68, тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4112.